

ХТО АДКРЫВАЕ БЕЛАРУСЬ?

5

ЦУДЫ СВАІМІ РУКАМІ

8



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 СТУДЗЕНЯ 2022 г. АЎТОРАК № 5 (29627)

## КОРАТКА

• Старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў даручыў найбольшую ўвагу ўдзяліць інфармаванню мінчан аб усіх зменах у рабоце грамадскага транспарту, асабліва на пр. Пераможцаў і вул. М. Багдановіча.

• Пераможцаў конкурсу «Беларускі салавей» назавуць 18 студзеня, іх павіншуе сын Змітрака Бядулі.



• КХЛ адмяніла яшчэ пяць матчаў з-за каранавіруса.

• Вялікі тэатр Беларусі пакажа новую «Спячую прыгажуню». Плануецца, што новы балет стане падарункам гледачу да Дня тэатра.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей НАЛІВАЙКА, міністр па падатках і зборах:**

*«Па даных на 1 студзеня, 98,5 % аўтаўладальнікаў краіны ўнеслі аванс за транспартны падатак. Пры гэтым я б не стаў гаварыць, што астатнія аўтаамататары — парушальнікі. Бывае, што губляюцца квітанцыі. Тут трэба правесці некалькі тыдняў па выбарцы, аналізе і супастаўленні інфармацыі. Думаю, што 99 % плацельшчыкаў выканалі свае падатковыя абавязацельствы. На мой погляд, гэта чарговы раз пацвярджае, што грамадзяне ў нашай краіне законапаслухмяныя».*

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Неабходна займацца сваімі пытаннямі і бачыць сваю бяспеку»

## Пазачарговая сесія Савета калектыўнай бяспекі АДКБ з удзелам Прэзідэнта Беларусі прайшла ў відэафармаце

**Асноўная тэма размовы — сітуацыя ў Казахстане і меры па яе нармалізацыі. Мадэратарам выступіў прэм'ер-міністр Арменіі Нікол Пашынян як старшыня Савета калектыўнай бяспекі АДКБ. Ён адкрыў сесію хвілінай маўчання ў памяць ахвяр беспарадкаў, аб'явіў парадак сустрэчы, рэгламент і выступіў з першым словам. Далей пра сітуацыю ў краіне расказаў Прэзідэнт Казахстана Касым-Жамарт Такаеў. За ім пра аказанне міратворчай дапамогі Казахстану паведаміў генеральны сакратар АДКБ Станіслаў Зась. Пасля ў рэгламенце былі выступленні прэзідэнтаў Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, Расіі Уладзіміра Пуціна, Таджыкістана Эмамалі Рахмона, старшыні Кабінета міністраў — кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Кыргызстана Акылбека Жапарава, прэм'ер-міністра Арменіі Нікола Пашыняна.**



Фота БелТА.

У пачатку свайго выступлення на сесіі Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні народу Казахстана ў сувязі з гібеллю супрацоўнікаў праваахоўных органаў, ваеннаслужачых і мірных жыхароў, падзякаваў за інфармацыю казахстанскага калегі пра сітуацыю ў краіне.

СТАР. 2

# Клёвы Сож



Жыхар Гомеля Арцём Дзядок, нягледзячы на ўзрост (яму толькі трыццаць), — рыбак з вялікім стажам і досведам. Свае рыбацкія ўніверсітэты ў дзяцінстве і юнацкім узросце атрымліваў ад дзеда, які вучыў хлопца, як трэба перахітрыць рыбу, але і ведаць паводзіны на вадзе і лёдзе. Таму, ведаючы, што лёд пасля адлігі не надта надзейны, Арцём прымае ўсе меры перасцярогі, каб не трапіць у бяду. І ў першую чаргу ён не выходзіць на небяспечныя праточныя вадаёмы.

А нядаўна, якраз калі былі моцныя маразы, мне давялося быць сведкам, як «гомсельмашаўскі» аператар станкоў на адной з ціхіх прысожскіх бухт у вольны час «паляваў» на шчупакоў — адзін за адным даставаў іх з лунак. І з такім трафеем, які пацягнуў на кіло дзвесце грамаў, я і сфатаграфаваў удачлівага гамяльчаніна на памяць.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

З новага года...

# Выраслі мінімальны заробак, базавая велічыня і базавая стаўка

### Што мяняецца ў заробках, у тым ліку бюджэтнікаў, з пачатку года

**Са студзеня гэтага года выраслі мінімальная заработная плата, памер базавай стаўкі (ад яе залежыць зарплата бюджэтнікаў), а таксама базавая велічыня, якая ўплывае на некаторыя стыпендыі, дапамогі, падаткі, штрафы і іншыя выплаты, у прыватнасці дапамогу беспрацоўным. Нагадаем, што мяняецца ў нашых заробках, падатках, штрафах і іншых выплатах, якія беларусы могуць атрымаць ужо ў студзені.**

СТАР. 4

# «Неабходна займацца сваімі пытаннямі і бачыць сваю бяспеку»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Аналіз падзей у Казахстане паказвае наяўнасць знешняга фактару. Іх сцэнарый пазнавальны. Пра што сказаў Прэзідэнт Казахстана. За аналогіямі далёка хадзіць не трэба: Югаславія, Ірак, Лівія, Сірыя, Украіна, Афганістан. Не так даўно падобны камбінаваны націск перажыла і Беларусь. Канешне, у гэтых краінах былі свае асаблівасці, але агульны почырк мы бачым», — заўважыў Прэзідэнт і дадаў, што знешні фактар пратэстаў ніколі не бывае адзіны: за імі заўсёды стаяць і ўнутраныя праблемы.

Па яго словах, вакол Цэнтральна-Азіяцкіх краін постсавецкай прасторы шмат ахвотных узарваць сітуацыю, а на граніцах Казахстана згуртаваліся міжнародныя тэрарысты.

Пераадолець негатыўныя тэндэнцыі, заўважае Аляксандр Лукашэнка, неабходна перадусім разам блізкім народам Казахстана і Кыргызстана, а ўрок павінен з гэтага ўзяць Узбекістан. У адваротным выпадку, дадае ён, позіркі дэструктыўных сіл будуць кінутыя на гэту краіну.

«Аналізуючы сітуацыю ў Беларусі, мы зыходзім з таго, што акрамя знешніх прычын (у нас яны відавочныя былі, у Казахстане зараз не вельмі — Прэзідэнт Казахстана спрабуе дакапацца да сутнасці, упэўнены, ён гэта зробіць) былі і ўнутраныя прычыны. Гэтаксама і ў іншых рэспубліках. Неабходна гэта засвоіць. Калі мы гэтага не зразумеем і будзем наракаць толькі на знешнія прычыны, значыць, мы можам атрымаць паўтарэнне падзей», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён нагадаў, што пра рызыкі і пагрозы, звязаныя са стварэннем у Цэнтральна-Азіяцкім рэгіёне спячых ячэек тэрарыстаў і экстрэмістаў, якія ў адзін момант могуць прачнуцца, неаднаразова казаў Эмамалі Рахмон. «Мы прымалі гэта да ўвагі, але, мусіць, недаацанілі рызыкі. Давайце шчыра, думалі, што нас гэта абміне. А зараз бачым, што асноўны касцяк пратэстоўцаў у Казахстане складаюць прафесійныя баевікі-тэрарысты. Гэта вельмі небяспечная тэндэнцыя. Неабходна разабрацца, хто іх арганізоўваў і хто імі кіраваў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Але нас чакаюць сур'ёзныя выклікі ў перспектыве. Неабходна ўмацоўваць АДКБ, спакойна і планамерна нарошчваць усе яе кампаненты і перш за ўсё міратворчы патэнцыял. Вельмі важна захаваць мабільнасць і аператыўнасць дзеянняў. І не трэба залішне саромецца ў гэтым плане, азіраючыся на нейкі Захад, Амерыку ці нейкія іншыя дзяржавы. Будзем рэзка глядзець па баках — звернем шыю. Неабходна займацца сваімі пытаннямі і бачыць сваю бяспеку», — акцэнтуе ўвагу кіраўнік краіны.

Ён мяркуе па актыўнасці заходніх палітыкаў, што там уважліва адсочваюць сітуацыю ў Казахстане, але спачатку ўзялі паўзу ў некалькі дзён.

«Мы з Прэзідэнтам Расіі пра гэта казалі пастаянна. Што мы планавалі, як гэта бачылі, так і адбылося — пасыпаліся заявы. Заявы зразумелыя: дэмакратыя, свабода, непрыняцце жорсткіх мер і гэтак далей», — расказаў кіраўнік краіны.

Відавочна, дадаў ён, што ўвод Калектыўных сіл АДКБ парушыў планы заказчыкаў і выканаўцаў справакаванага канфлікту. Гэта яшчэ раз пацвярджае правільнасць рашэння.

«Хацеў бы заўважыць, што нам неабходна абавязкова адсочваць сітуацыю і дзейнічаць на папярэджванне, купіраваць магчымыя прычыны, што могуць прывесці да такіх наступстваў», — сказаў Прэзідэнт.

На папярэджванне, дадаў ён, неабходна дзейнічаць і ў інфармацыйным полі: нельга дапускаць выстаўлення міратворчага кантынгенту як акупантаў. «Такія спробы ўжо ёсць. Мы ніякія не акупанты. Мы не па сваім жаданні прыйшлі туды. Нас запрасіў наш брат, сябар, які адказвае за вялізную краіну (Прэзідэнт Казахстана. — **«Зв.»**). Мы аказалі тую падтрымку, якую ён патрабаваў ад нас. Гэта прэцэдэнт, добры прэцэдэнт», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Разгортванне Калектыўных міратворчых сіл АДКБ у Казахстане ў поўным аб'ёме, расказаў на сесіі **генсек АДКБ Станіслаў ЗАСЬ,** завяршылася ў нядзелю. Па яго словах, кантынгенты міратворцаў дыслацыруюцца ў Нурсултане, Алматы і Алмацінскай вобласці.

«Адносна ўзгодненага з казахстанкім бокам планам аперацыі Калектыўныя міратворчыя сілы прыступілі да выканання задач па ўзмацненні аховы і абароны важных дзяржаўных і ваенных аб'ектаў, а таксама па стварэнні ўмоў для стабілізацыі абстаноўкі ў зонах адказнасці», — паведаміў Станіслаў Зась.

Па папярэдніх выніках ён сцвярджае, што механізм выкарыстання міратворчых сіл АДКБ рэальна працуе і яны здольны выконваць пастаўленыя задачы.

Сёння, як ніколі раней, у рамках арганізацыі неабходна павышаць узровень палітычнага ўзаемадзеяння, каардынацыю пазіцый на міжнароднай арэне, акцэнтаваў Прэзідэнт Беларусі.

«Формы і метады аказання гібрыднага ўплыву на нашы краіны якасна ўдасканальваюцца. У рамках АДКБ неабходна выпрацоўваць адэкватныя меры рэагавання. Як я ўжо казаў, без аглядкі. Варта ўдасканальваць інфармацыйны абмен і якасна паляпшаць аналітычны складнік. Рост напружанасці нас таксама падштурхоўвае да рэвізіі сумесных мер па супрацьдзеянні тэрарызму і экстрэмізму», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён заўважыў, што варта ў найбліжэйшыя часы сабрацца і абмеркаваць бяспеку Таджыкістана, аказаць матэрыяльную падтрымку ваеннай тэхнікай гэтай краіне.

«Мы шмат увагі ўдзялілі барацьбе з міжнародным тэрарызмам, магчыма, недаацэньваючы небяспеку, якую нясе экстрэмізм ва ўсіх яго праявах. Неабходна своечасова выкрываць сілы, якія ў пэўных умовах здольныя пераходзіць чырвоную рысу, становячыся на шлях гвалту, а таксама жорстка спыняць іх дэструктыўную дзейнасць», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што краіны-партнёры заўсёды могуць разлічваць на падтрымку Беларусі, а ўлады нашай краіны будуць верныя дамоўленасцям.

Пасля саміту Савета калектыўнай бяспекі АДКБ **дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Беларусі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ** адзначыў журналістам, што народ Казахстана сутыкнуўся з цяжкім выпрабаваннем: у выніку ўзброенага мяцяжу, арганізаванага з мэтай дзяржаўнага перавароту, загінулі людзі, у тым ліку прадстаўнікі праваахоўных органаў, разбурана інфраструктура. «Але мяцежнікам, асноўны касцяк якіх складалі баевікі-тэрарысты, не атрымалася пасеяць у краіне хаос, развязаць братазабойчую вайну», — сказаў Аляксандр Вальфовіч.

Па словах дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі, у рэгіёне своечасова было ўведзена надзвычайнае становішча, а падчас контртэрарыстычнай аперацыі баевікам дадзены жорсткі і рашучы адказ. Увядзенне міратворчага кантынгенту АДКБ, які ўзяў пад ахову стратэгічна важныя аб'екты, дазволіла сілавым структурам Казахстана засяродзіць намаганні на нармалізацыі сітуацыі, пошуку і ліквідацыі ўзброеных бандфарміраванняў.

Дзяржсакратар Савета бяспекі таксама звярнуў увагу на тое, што Прэзідэнт Беларусі дакладна ўказаў на ўплыў знешняга фактару ў падзеях, што адбываюцца ў Казахстане, — умяшанне калектыўнага Захаду ніколі ні да чога добрага не прыводзіла.

«Па апошніх звестках, сітуацыя ў Казахстане нармалізуецца. Але ўжо сёння трэба зрабіць высновы і атрымаць урокі з таго, што адбылося, — адзначыў Аляксандр Вальфовіч. — Важна ўдасканальваць міратворчую дзейнасць АДКБ, нарошчваць патэнцыял арганізацыі па аператыўным рэагаванні на такія крызісныя сітуацыі, умацоўваць узаемадзеянне ў рамках інтэграцыйных аб'яднанняў. Асаблівую ўвагу неабходна надаць процідзеянню тэрарызму і экстрэмізму ва ўсіх іх праявах. Перш за ўсё, дзейнасці так званых спячых тэрарыстычных ячэек. Ад гэтага сёння не застрахаваны ніхто».

# Перажываем як уласную трагедыю

**Учора ў Казахстане быў дзень нацыянальнай жалобы па загінулых падчас беспарадкаў. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне Прэзідэнту Казахстана Касым-Жамарту Такаеву, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

«Беларускі народ з трывогай успрыняў драматычныя падзеі, што адбыліся ў брацкім Казахстане. Арганізаваная на вашу краіну атака бандфарміраванняў, якая прывяла да шматлікіх чалавечых ахвяр і разбурэнняў, чарговы раз паказала ўсім нам страшную пагрозу, якую нясе свету міжнародны тэрарызм. Відавочна падрыўная мэта экстрэмістаў — дэстабілізаваць шматнацыянальны Казахстан, пасеяць хаос, развязаць у краіне братазабойчую вайну для ўчынення антыканстытуцыйнага перавароту і змянення палітычнага курсу», — гаворыцца ў спачуванні.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь ужо сутыкалася з такім выклікам, таму разумее ўсю вастрыню сітуацыі і каласальную адказнасць за лёс краіны, што лягла на плечы яе кіраўніцтва.

«Вельмі цяжкія выпрабаванні, якія выпалі брацкаму народу Казахстана, беларусы перажываюць як уласную трагедыю. Мы выказваем надзею на хутчэйшае ўстанаўленне міру і спакою на казахстанскай зямлі і гатовы ўсяляк садзейнічаць стабілізацыі сітуацыі», — запэўніў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка папрасіў Касым-Жамарта Такаева перадаць словы глыбокага спачування і падтрымкі родным і блізкім загінулых, а таксама пажаданні хутчэйшага выздараўлення пацярпелым.

# Усёабдымнае партнёрства для новых вынікаў

**Учора адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і Старшыні КНР Сі Цзіньпіна, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі шырокі спектр пытанняў міжнароднага, двухбаковага і ўнутранага парадку дня.

Гэтымі днямі Беларусь і Кітай адзначаць важную дату ў гісторыі двухбаковага супрацоўніцтва — 30-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін. У сувязі з гэтым лідары абмяняліся віншаваннямі і прадметна абмеркавалі бягучыя праекты і магчымасці для пашырэння ўзаемадзеяння па многіх напрамках. Бакі дамовіліся паглыбіць узаемавыгаднае супрацоўніцтва паміж краінамі і развіваць кітайска-беларускае ўсёабдымнае стратэгічнае партнёрства для пастаяннага дасягнення новых вынікаў.

Як было падкрэслена, Кітай і Беларусь эфектыўна супрацоўнічаюць у шматбаковых арганізацыях і цвёрда падтрымліваюць адзін аднаго ў абароне сваіх асноўных інтарэсаў, што адлюстроўвае стратэгічную каштоўнасць кітайска-беларускага супрацоўніцтва.

Што датычыцца актуальнага міжнароднага парадку дня, Прэзідэнт Беларусі і Старшыня КНР абмяняліся меркаваннямі наконт сітуацыі ў Казахстане. Аляксандр Лукашэнка праінфармаваў калегу аб дзейнасці міратворчых сіл АДКБ у гэтай краіне і аб выніках пазачарговага пасяджэння СКБ АДКБ.

Закранулі Аляксандр Лукашэнка і Сі Цзіньпін у размове і тэмы, якія датычацца процідзеяння пандэміі COVID-19, а таксама супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы.

## • У тэму

**Кітай выступае супраць умяшання знешніх сіл ва ўнутраныя справы Беларусі і, як заўсёды, падтрымлівае Беларусь у руху па шляху развіцця, які адпавядае яе ўласным нацыянальным умовам. Пра гэта гаворыцца ў паведамленні МЗС Кітая па выніках тэлефоннай размовы лідараў Беларусі і Кітая Аляксандра Лукашэнкі і Сі Цзіньпіна.**

Сі Цзіньпін падкрэсліў, што цяперашняя міжнародная і рэгіянальная сітуацыя складаная і развіваецца. Кітай і Беларусь эфектыўна супрацоўнічаюць у шматбаковых арганізацыях, такіх як Арганізацыя Аб'яднаных Нацый, і цвёрда падтрымліваюць адно аднаго ў абароне сваіх асноўных інтарэсаў, што адлюстроўвае стратэгічную каштоўнасць кітайска-беларускага супрацоўніцтва. «У новай сітуацыі абодва бакі павінны працягваць цесна супрацоўнічаць, практыкаваць сапраўдны шматбаковы падыход, падтрымліваць міжнародную сістэму з ААН у якасці ядра і міжнародны парадак, заснаваны на міжнародным праве, і забяспечваць міжнародную справядлівасць і правасуддзе. Кітай выступае супраць умяшання знешніх сіл ва ўнутраныя справы Беларусі і, як заўсёды, падтрымлівае Беларусь у руху па шляху развіцця, які адпавядае яе ўласным нацыянальным умовам», — гаворыцца ў паведамленні па выніках размовы.

**Беларусь і Кітай за 30 гадоў існавання дыпламатычных адносін дасягнулі найвышэйшага пункта супрацоўніцтва — жалезнага братэрства і ўсепагоднага партнёрства. Аб гэтым заявіў журналістам першы намеснік прэм'ер-міністра Мікалай Снапкоў.**

Першы віцэ-прэм'ер адзначыў важнасць учарашняй тэлефоннай размовы лідараў Беларусі і Кітая. Пасля такіх гутарак двухбаковыя адносіны знаходзяць дадатковы імпульс. А ў дадзеным выпадку ім зададзена і новая парадыгма, перакананы Мікалай Снапкоў. «Самы галоўны і, на мой погляд, вельмі важны вынік у тым, што лідары дамовіліся да 30-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін павысіць узровень супрацоўніцтва да жалезнага братэрства і ўсёпагоднага партнёрства. Гэта не проста словы, а фактычна, з пункту гледжання рытуалаў і правілаў супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння Кітая з іншымі краінамі, найвышэйшы пункт», — падкрэсліў ён.

У 2021 годзе зафіксаваны рэкордны прырост колькасці рэзідэнтаў Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень», паведаміў Мікалай Снапкоў. «У 2021 годзе, хоць гэта і санкцыйны, і постковідны год, у нас фактычна адбыўся рэкордны прырост рэзідэнтаў — 21 зарэгістраваўся ў парку. Сёння іх 85, з іх 43 — з Кітайскай Народнай Рэспублікі з агульным аб'ёмам інвестыцый $1,2 млрд. Нягледзячы на ўсе складанасці сусветнага парадку дня і знешніх агрэсіўных уплываў на нашу краіну, мы бачым, што актыўныя ўзаемаадносіны з Кітаем ажыццяўляюцца. Так будзе і ў будучыні», — падкрэсліў першы віцэ-прэм'ер.

Ён адзначыў, што ў індустрыяльным парку «Вялікі камень» рэалізуецца найважнейшы праект Gateway па будаўніцтве мультымадальнага лагістычнага порта сумеснымі намаганнямі кампаній з чатырох краін — Швейцарыі, Германіі, Кітая і Беларусі. «Нядаўна сваю гатоўнасць да ўдзелу ў акцыянерным капітале пацвердзілі Кітайскія чыгункі. Гэта для нас вельмі важна», — сказаў Мікалай Снапкоў.

Паводле яго слоў, рэалізацыя гэтага праекта абмяркоўвалася ў ліку іншых пытанняў ў тэлефоннай размове лідараў Беларусі і Кітая, і Сі Цзіньпін адзначыў гэты праект як адзін з узорных і перспектыўных.

«Нягледзячы на складанасці ў тавараабароце праз чыгунку, праз сухапутны шлях, я думаю, што наша дамінуючая пазіцыя як лагістычнага хаба, як найбольш кароткага шляху з захаду на ўсход і з усходу на захад будзе захоўвацца і прымнажацца», — перакананы першы віцэ-прэм'ер.

# «ПЕРАЗАГРУЗКА ДЗЯРЖАВЫ ПАВІННА ІСЦІ ЭВАЛЮЦЫЙНЫМ ШЛЯХАМ»

**Старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, член Канстытуцыйнай камісіі Валянцін СЕМЯНЯКА падзяліўся ўласным бачаннем тых працэсаў, дзякуючы якім Беларусь чакаюць сапраўды глабальныя пераўтварэнні. Менавіта так ацэньвае Валянцін Семянякa сучасны этап развіцця краіны. На яго думку, у беларусаў з'явіўся рэальны шанц перазагрузіць дзяржаўную сістэму, і гэтым шанцам неабходна скарыстацца.**

***— Валянцін Міхайлавіч, падчас вашай сустрэчы з актывам Гродна вы зрабілі акцэнт на перазагрузцы нашага грамадства пасля прыняцця новага праекта Канстытуцыі. Чаму вы так лічыце?***

— Галоўныя два моманты. Папершае, сёння беларускаму грамадству прапаноўваецца цывілізаваны пераход на новы ўзровень дзяржаўных адносін. Гэта значыць, перазагрузка ўсяго дзяржаўнага апарату мірным шляхам, што вельмі важна для беларусаў, якія шукаюць і знаходзяць правільныя рашэнні. Рознага роду рэвалюцыі — «каляровыя», «аранжавыя» — як правіла, паграджаюць дзяржаўнасці, зніжаюць узровень дабрабыту насельніцтва, разбураюць эканамічныя і палітычныя сувязі.

Наступны момант. На ўсіх этапах работы над праектам Канстытуцыі мы раімся з людзьмі. Для нас важна, з аднаго боку, данесці сваю думку, з другога — пачуць меркаванні людзей. Такім чынам, даём магчымасць нашым грамадзянам удзельнічаць у палітычным дыялогу. І ў выніку дыялогу можам знайсці кансэнсус. На дадзеным этапе важна данесці філасофію, ідэалогію, якая закладзена ў змяненнях і дапаўненнях. А менавіта тое, што перазагрузка фармату розных галін улады вядзецца з мэтай збалансаваць і вывесці на новы ўзровень адносіны паміж выканаўчай і заканадаўчай уладамі, паміж цэнтрам і рэгіёнамі, паміж мясцовай уладай і грамадзянамі. Праз абмеркаванне праблемных момантаў вядзецца калектыўны пошук выхаду са складзенай сітуацыі.

***— Чым абумоўлена распрацоўка дапаўненняў і змяненняў у Канстытуцыю менавіта на дадзены момант? Чаму гэта адбываецца цяпер, а не пазней і не раней?***

— Новы праект вельмі добра кладзецца на пяцігадовы план. Калі мы паспяхова рэалізуем канстытуцыйную рэформу і за два гады прывядзём у адпаведнасць з Канстытуцыяй заканадаўчую базу, будзем гатовы да фарміравання новых органаў — прэзідэнта, парламента, Усебеларускага народнага сходу, урада. І, магчыма, на наступную пяцігодку ўжо на новай заканадаўчай базе будзем працаваць па рэалізацыі тых праграм, якія на гэту пяцігодку прымаюцца.

Верагодна, падзеі 2020 года нейкім чынам паўплывалі на гэтыя працэсы. Але на той момант прымацца за распрацоўку новай Канстытуцыі наўрад ці было мэтазгодным, бо захлыналі эмоцыі.

***— Мы становімся сведкамі таго, што работа над змяненнямі і дапаўненнямі ў Канстытуцыю пераходзіць у актыўную фазу ўсенароднага абмеркавання. А як вы ацэньваеце актыўнасць грамадзян падчас падрыхтоўкі новага праекта Канстытуцыі?***

— У перыяд работы над праектам паступалі тысячы прапаноў. Увогуле, увесь працэс падрыхтоўкі новага праекта ішоў з удзелам грамадзян: і на этапе збору прапаноў, і на этапе работы Канстытуцыйнай камісіі, і пры іх апрацоўцы. Вельмі важна ў гэты час весці дыялог, каб ён у поўнай ступені адлюстраваў пажаданні беларусаў. Тыя навацыі, якія там закладзены, дадуць магчымасць не проста пераадолець нейкія крызісныя з'явы ў нашым грамадстве, але і ўпэўнена развівацца.

***— І надалей работа будзе скіравана на дыялог з грамадствам?***

— На гэта скіравана восем асноўных раздзелаў новага праекта. Тут унесены нормы, якія сапраўды дазваляюць арганізаваць шырокі грамадскі дыялог. У пераходных нормах сказана, што на працягу двух гадоў мы павінны перазагрузіць усю заканадаўчую сістэму. Законы чакаюць рэзанансныя: гэта Выбарчы кодэкс, Закон аб Усебеларускім сходзе, аб мясцовым самакіраванні і многія іншыя. За два гады, згодна з новай Канстытуцыяй, нам гэтую работу прыйдзецца правесці. Шырокае абмеркаванне будзе праходзіць па кожным з гэтых законаў. Менавіта ў іх атрымаюць далейшае развіццё ідэі, якія закладваліся ў Асноўны Закон.

***— Ці адчуюць дэпутаты, у тым ліку дэпутаты парламента, узмацненне сваёй улады і магчымасцяў?***

— Сёння ў парламента нямала паўнамоцтваў. Кожны квартал мы рыхтуем справаздачы па рабоце і інфармуем урад, Адміністрацыю Прэзідэнта аб праблемах, якія існуюць. Права заканадаўчай ініцыятывы ніхто не забіраў, яго можам у поўнай ступені рэалізаваць. Тое ж і з прыняццем законаў.

Разам з тым нашы паўнамоцтвы будуць пашыраны. І мы да гэтага гатовы, як і да адказнасці, якая прадугледжвае іх пашырэнне. У сувязі з гэтым працуем у цесным узаемадзеянні з урадам. Віцэ-прэм'еры пастаянна выступаюць перад парламентам са справаздачамі. Ставім перад урадам розныя пытанні, у тым ліку праблемныя, каб агульна іх вырашаць. Напрыклад, мае выбаршчыкі агучылі праблему, звязаную з выдзяленнем субсідый для шматдзетных сем'яў. Аказалася, існуючая да нядаўняга часу практыка «вымывае» маладыя сем'і з сяла. Я паставіў пытанне перад профільным віцэ-прэм'ерам. У выніку з 1 студзеня ўступілі ў сілу змяненні па субсідзіраванні жылля для шматдзетных сем'яў у сельскай мясцовасці. Як бачыце, усё магчыма, галоўнае — каб дэпутаты актыўна карысталіся сваімі правамі.

Што датычыцца работы над праектам Канстытуцыі, парламентарыям давялося разгледзець тысячы прапаноў ад калектываў і грамадзян. Штодзень каля сотні зваротаў паступала толькі на інтэрнэт-партал Палаты прадстаўнікоў. Праўда, многія не датычыліся Канстытуцыі. Між тым усе прапановы прыняты да ўвагі, не сышлі ў нябыт, а накіраваны ў профільныя камісіі для далейшага разгляду на заканадаўчым узроўні.

***— На якія моманты часцей за ўсё звярталі ўвагу беларусы ў сваіх прапановах адносна новай Канстытуцыі?***

— Многія пісалі аб неабходнасці захавання гістарычнай памяці беларускага народа. Гэта знайшло адлюстраванне ў праекце. У артыкуле 15 замацавана палажэнне аб тым, што забяспечваецца захаванне гістарычнай праўды і памяці беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Мабыць, нашы ветэраны не думалі, што гэты пасыл давядзецца абараняць у Асноўным Законе. Але такая сітуацыя стала магчымай на фоне розных выказванняў аб тым, што вайна — гэта не так і страшна. Мы пайшлі на тое, каб абараніць скіраванасць краіны на мірны шлях развіцця. Разам з тым выкраслілі норму аб нейтралітэце, а замянілі тым, што Беларусь можа выкарыстоўваць калектыўную абарону для захавання суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці краіны.

***— Згодна з праектам Канстытуцыі, Беларусь застаецца прэзідэнцкай рэспублікай. У той час вельмі шмат паўнамоцтваў атрымлівае Усебеларускі сход. Ці няма ў гэтым супярэчлівасці?***

— Няма. Мы пакідаем прэзідэнцкую рэспубліку. Калі гаварыць проста, у нас суперпрэзідэнцкая рэспубліка. Па Канстытуцыі 1996 года мы падтрымалі даволі значныя паўнамоцтвы Прэзідэнта. Цяпер, будзем гаварыць шчыра, узнікае небяспека, ці здужае новы Прэзідэнт з гэтымі паўнамоцтвамі справіцца, ці не будзе ён імі злоўжываць. Таму ствараецца такі орган, які пры неабходнасці зможа спыніць Прэзідэнта ажно да імпічменту. Гэта прадстаўнічы орган, з удзелам 1200 чалавек, які выбіраецца тэрмінам на пяць гадоў. Наўрад ці такой колькасцю можна маніпуляваць. І апошні Усебеларускі сход якраз гэта і паказаў. Дэбаты ішлі ў адкрытым фармаце, не кажучы пра кулуары. Таму гэта вельмі правільна, што ствараюцца дзве галіны ўлады, якія будуць дапаўняць адна адну, узаемадзейнічаць і пры неабходнасці стрымліваць.

***— Ці ішла гаворка пра парламенцкую рэспубліку падчас работы над абнаўленнем Канстытуцыі?***

— Такія прапановы былі, хоць і няшмат. Але мы арыентаваліся перш за ўсё на большасць, у тым ліку на сацыялагічныя апытанні. А яны схіляюцца да прэзідэнцкай рэспублікі. Разам з тым сёння мы закладваем у Канстытуцыю сістэму ўзаемадзеяння розных галін улады. Грамадзяне згодны з тым, каб рэспубліка была прэзідэнцкай, але павінен быць прадстаўнічы орган, які мог бы стрымліваць Прэзідэнта ў некаторых яго дзеяннях. Гэта свайго роду ахоўная грамата для грамадства. І такія паўнамоцтвы перадаюцца Усебеларускаму народнаму сходу.

***— Які, на ваш погляд, важны прагрэсіўны аспект можна адзначыць у новым праекце Асноўнага Закона. Магчыма, тое, што дапаможа вырашаць складаныя пытанні?***

— Я б назваў у гэтым плане новую пазіцыю Канстытуцыйнага Суда. У прыватнасці, яму даецца права канстытуцыйнага кантролю за выкананнем усіх заканадаўчых нарматыўных актаў на тэрыторыі дзяржавы, у тым ліку і па індывідуальных скаргах грамадзян.

У маёй дэпутацкай рабоце неаднаразова ўзнікалі праблемы, звязаныя з судовай практыкай. Чалавек, напрыклад, не згодны з рашэннем суда. Калі я пачынаю кансультавацца з юрыстамі, мне кажуць: суд паступіў правільна, а вось закон не зусім справядлівы. Цяпер мы прапануем увесці норму, па якой і суд, які разглядае справу, і грамадзянін, які ў ёй удзельнічае, зможа звярнуцца ў Канстытуцыйны Суд са скаргай на той закон, па якім яго судзілі. У выпадку, калі закон будзе прызнаны неадпаведным Канстытуцыі, Канстытуцыйны суд мае права накласці забарону на гэты закон і накіраваць яго на перагляд. Такая форма, лічу, даволі прагрэсіўная.

Узмацняюцца кампетэнцыі ўрада і прэм'ер-міністра. Цяпер Савет Міністраў будзе кіраваць сістэмай мясцовых выканаўчых і заканадаўчых органаў. Гэта вельмі правільна. Бо вертыкаль існуе, але канстытуцыйна не афармлена. Раней гэтую функцыю браў на сябе Прэзідэнт.

***— А што наконт рэферэндуму? Як мы будзем галасаваць? Па старых законах ці па новых?***

— Па выбарчай сістэме прапануем выключыць палажэнне аб тым, што ў галасаванні не прымаюць удзел асобы, якія знаходзяцца пад вартай, але рашэння суда пакуль няма. Такія асобы, на наш погляд, павінны прымаць удзел у галасаванні. Дадалі вылучэнне кандыдатаў палітычнымі партыямі і выключылі вылучэнне грамадскімі арганізацыямі. Па-ранейшаму сваіх кандыдатаў у дэпутаты змогуць вылучаць працоўныя калектывы. Рэферэндум па праекце Канстытуцыі мае адбыцца ў канцы лютага.

***— Ці павінны вывешвацца пратаколы галасавання?***

— Калі закон патрабуе, каб яны вывешваліся, патрэбна. Лічу, што пратаколы вывешваць трэба, паколькі ў Выбарчым кодэксе гэта прапісана. Будзем настойваць на тым, каб рабіць гэта.

***— І апошняе. Чаму важна прыйсці на рэферэндум?***

— Рэферэндум адбудзецца тады, калі на ўчасткі для галасавання прыйдзе больш чым палова грамадзян, якія ўнесены ў спісы. Пытанне лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала больш чым палова выбаршчыкаў.

Вельмі важная свядомая пазіцыя грамадзян у адносінах да гэтага працэсу. Мы сапраўды хочам пераўтварэнняў, не кажам, што нас усё задавальняе і нічога не трэба мяняць. Гэта не так. Менавіта рэферэндум і можа пачаць гэты працэс. Літаральна за два гады павінны прывесці ў адпаведнасць з Канстытуцыяй і многія іншыя нарматыўныя дакументы.

Чаму цяпер важна, каб беларусы прыйшлі на рэферэндум і мы змаглі выпрацаваць той варыянт змяненняў, які б задаволіў большасць нашых грамадзян? Бо калі гэтага не адбудзецца, прыйдзецца зноў таптацца на месцы, час будзе згублены. Зараз жа прапануецца найбольш перспектыўны алгарытм: праводзім рэферэндум, потым два гады працуем над змяненнем заканадаўчай базы, перазагружаем і на гэтай аснове выходзім на новыя адносіны — міждзяржаўныя, міжасабовыя. Гэта найбольш аптымальная дарожная карта, якую трэба прыняць і па ёй рухацца далей. Сёння мы ідзём па шляху перамен, рэальных перамен. Пацвярджаем гатоўнасць да перамен і праводзім іх цывілізаваным, законным шляхам. І гэта вельмі важна. Запатрабаванасць на гэтыя змяненні ёсць. Але трэба перазагрузіць нашу сістэму улады менавіта эвалюцыйным, а не рэвалюцыйным. І рэферэндум — спосаб не толькі правільны і законны, але яшчэ і самы аптымальны ва ўмовах сусветнага крызісу і таго ціску, які аказваецца на нашу краіну.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

## ДАСЛОЎНА

**Наталля КАЧАНАВА, Старшыня Савета Рэспублікі:**



## Людзі нацэленыя на канструктыўную работу па абмеркаванні Асноўнага Закона

— Калі мы арганізавалі работу грамадскай прыёмнай у Савеце Рэспублікі, я меркавала, што людзі прыйдуць не толькі з пытаннямі, якія датычацца Асноўнага Закона нашай краіны, але і са звычайнымі жыццёвымі пытаннямі. У прынцыпе, так і атрымалася. Але ў большай ступені пытанні датычыліся Асноўнага Закона нашай краіны.

Я пачула, што людзі нацэлены на канструктыўную работу па абмеркаванні Асноўнага Закона нашай краіны.

У большай ступені гэта жыллёвыя пытанні, будаўніцтва і эксплуатацыі жылога фонду, добраўпарадкавання населеных пунктаў.

Нягледзячы на тэматыку зваротаў, людзей абавязкова выслухаюць і над іх пытаннямі будуць працаваць спецыялісты. Таму што палітыка, якая праводзіцца ў нашай краіне, скіравана на кожнага чалавека. Калі ў яго ёсць пытанні, што перашкаджаюць яму жыць, вядома, мы павінны выслухаць і зрабіць усё, каб аказаць яму садзейнічанне, несумненна, у рамках закона.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

*Больш падрабязна аб прыёме грамадзян, які правяла Старшыня Савета Рэспублікі чытайце ў найбліжэйшым нумары «МС».*

**Калі ў вас з'явяцца меркаванні з нагоды праекта — пішыце ў рэдакцыю або непасрэдна ў арганізацыю, якая будзе акумуляваць і аналізаваць усе заўвагі і прапановы, — Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі. Можна скарыстацца электроннай поштай sbor@ncpi.gov.by; можна запоўніць электронную форму, якая маецца на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале па адрасе: https://sbor.pravo.by; можна даслаць па пошце на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Берсана, 1А, НЦПІ, з пазнакай «Канстытуцыя».**

Адкрыцці

# «ДЗЕЦІ І МОЛАДЗЬ — САМАЕ ГАЛОЎНАЕ ДЛЯ КРАІНЫ»

**Акцэнтавала Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА падчас адкрыцця новага будынка сталічнай гімназіі № 41.**

У панядзелак, 10 студзеня, спікер верхняй палаты парламента прыняла ўдзел у цырымоніі ўрачыстага адкрыцця новай навучальнай установы па вуліцы Чурлёніса ў Мінску. Разам з ёй ганаровым госцем стаў **старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ**.

— Дзеці і моладзь — самае галоўнае для краіны. Мы разумеем, што за імі будучыня, паслая яны будуць кіраваць нашай цудоўнай краінай, — падкрэсліла спікер, упаўнаважаная Прэзідэнта па горадзе Мінску. — Ім і іх адукацыі ўдзяляюць шмат увагі, у тым ліку кіраўнік дзяржавы заўсёды ставіць сур'ёзныя задачы па ўдасканаленні матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў, зместу падручнікаў.

Яна перакананa, што ў гэтай гімназіі створаны цудоўныя ўмовы не толькі для вывучэння прадметаў, але і для рэалізацыі творчых і спартыўных здольнасцяў навучэнцаў. Спікер звярнула ўвагу: тут вучацца дзеці, якія атрымліваюць стыпендыі Прэзідэнта.


Фота БелТА.

— Гэта сведчыць у тым ліку аб тым, што ў навучальнай установе працуе цудоўны калектыў педагогаў, якія вучаць дзяцей і фарміруюць іх асобу, — падкрэсліла яна.

Наталля Качанава звярнула ўвагу, што дзеці павінны разумець і шанаваць тое, што для іх робіць старэйшае пакаленне.

— Важна разумець і любіць нашу краіну, тых людзей, якія жывуць побач з вамі.

Наталля Качанава ўручыла дырэктару сертыфікат на абсталяванне для новай школы і падзякавала педагагічнаму калектыву за іх шчырую і адказную працу.

— Выхаванне нашага падрастаючага пакалення заўсёды спалучана з глыбокай адказнасцю. Педагог заўсёды павінен павышаць сваю кваліфікацыю, таму што дзеці разумныя і таленавітыя, — адзначыла спікер.

Гімназісты, у сваю чаргу, падарылі Наталлі Качанавай карціну, выкананую самімі навучэнцамі. Яна падзякавала ім за каштоўны падарунак і запрасіла ў Савет Рэспублікі, каб бліжэй пазнаёміцца з дзейнасцю верхняй палаты парламента, сутнасцю работы сенатарскага корпуса.

Старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў таксама адзначыў добрыя ўмовы для вучобы і раскрыцця творчых талентаў юных мінчан, якія створаны ў гэтай установе адукацыі.

— Летась у 58 установах адукацыі сталіцы ішоў капітальны рамонт, у тым ліку ў 19 — з поўным адсяленнем. У горадзе абнавілі 31 школу, 10 дзіцячых садкоў. У 2022-м у Мінску працягнуць ствараць умовы для гарманічнага развіцця і навучання юных грамадзян нашай краіны, — паведаміў кіраўнік гарадской вертыкалі ўлады.

Трэба сказаць, што гімназія № 41 носіць званне адной з найстарэйшых і паспяховых навучальных устаноў сталіцы. Вучні штогод удзельнічаюць у міжнародных алімпіядах па матэматыцы, хіміі і інфарматыцы. Гэта, як і шмат іншага, дазволіла ўстанове з 2015 да 2017 і ў 2020 гадах заняць першае месца ў рэйтынгу сталічных гімназій.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Карысны вопыт

# Аб'ядналіся, каб рэалізаваць таленты і зарабіць грошы

**У Слаўгарадзе падвялі вынікі трохгадовага праекта «Сеткавае ўзаемадзеянне для паляпшэння магчымасцяў занятасці ў сельскіх раёнах Магілёўскай вобласці»**

**За гэты час былі падрыхтаваныя 195 мясцовых і рэгіянальных ініцыятыў, 23 з якіх рэалізаваны пры фінансавай падтрымцы знешняга донара праекта. Агульная сума падтрымкі склала 204 тысячы еўра.**

Толькі па Слаўгарадскім раёне было падтрымана шэсць рэгіянальных і мясцовых ініцыятыў. У вёсцы Хварасцяны ў пустым будынку школы абсталяваны цэнтр перапрацоўкі мясцовай сельскагаспадарчай прадукцыі, які каардынуе работу каля 20 чалавек — яны займаюцца вырошчваннем агародніны і грыбоў. Болей чым 20 чалавек з абмежаванымі магчымасцямі прынялі ўдзел у праекце «Зялёны горад — кветкавы рай», ідзя якога належыць пярвічных Слаўгарадскага аддзялення «Беларускай асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам». З імі праводзіліся трэнінгі і заняткі на тэму «Як праявіць сябе ў бізнесе і зарабіць грошы». Для мам, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, у рамках праекта закуплены цяпліцы і расада. Гэта дало ім магчымасць палепшыць матэрыяльны дастатак сям'і. Дзякуючы яшчэ адной ініцыятыве ў Слаўгарадзе створана тэатральная студыя «Эдэльвейс».

Вельмі добрыя вынікі атрыманы ў рэалізацыі рэгіянальных ініцыятыў. Напрыклад, слаўгарадскія сыравары распаўсюдзілі свой вопыт на Чэрыкаўскі і Краснапольскі раёны (ініцыятыва «На скрыжаванні густаў»). Зараз у бізнесе болей чым 20 новых членаў гэтага кірунку. Падтрымку атрымала «Мабільная школа аўтарскага рамяства», заяўнікам якой выступіла Слаўгарадскае аддзяленне Беларускага саюза жанчын, а партнёрамі сталі Быхаўская дзіцячая школа мастацкіх рамёстваў і Цэнтральная клубная сістэма з Клічава. Школа «Майстар — майстру», якая была створана ў выніку гэтага аб'яднання, дала магчымасць паспрабаваць сябе ў ролі рамесніках 50 жыхарам. У выніку створана сувенірная лаўка, і майстры атрымалі магчымасць прадаваць свае работы. Сумеснымі намаганнямі Слаўгарадскага, Краснапольскага і Чэрыкаўскага раёнаў заснаваны рэгіянальны клуб «Школа крэатыўнай індустрыі», адным з напрамкаў дзейнасці якога з'яўляецца аказанне аніматарскіх паслуг.



— Усяго ў рамках рэалізацыі праекта прыняла ўдзел каля 1500 чалавек, — адзначае **старшыня Слаўгарадскага райсавета Святлана ЯЗЕРСКАЯ**. — За гэты перыяд было праведзена болей чым 300 семінараў і трэнінгаў, 142 круглыя сталы, больш за 100 майстар-класаў, тры тыднёвыя летнія школы, удзел у якіх брала каля 100 чалавек. Праект скончыўся, але ў яго рамках працягваем падтрымліваць работу нашага рэгіянальнага савета па ўстойлівым развіцці. Туды ўваходзяць прадстаўнікі райвыканкамаў усіх пяці раёнаў, дэпутаты, грамадскасць. Яго задача — распаўсюджваць цікавую інфармацыю, шукаць ініцыятывы, дапамагаць людзям развіваць свае таленты. Аналіз паказаў, што праект пасадзейнічаў паляпшэнню ўмоў прадпрымальніцтва, павысіў узровень кампетэнцыі прадстаўнікоў мясцовай улады, якія працуюць з насельніцтвам, прадэманстраваў эфектыўнасць рэгіянальнага ўзаемадзеяння. За два гады было шмат чаго зроблена для абмену вопытам, пошуку партнёраў. Мы распрацавалі дарожную карту далейшага рэгіянальнага развіцця. Будзем павышаць устойлівасць ужо існуючых ініцыятыў і шукаць новыя.

Праект «Сеткавае ўзаемадзеянне для паляпшэння магчымасцяў занятасці ў сельскіх раёнах Магілёўскай вобласці» быў прызнаны сёлета на Магілёўшчыне пераможцам у намінацыі «Найлепшы рэалізаваны праект па дасягненні СУР-2035». Яго вынікі былі ўключаны ў Стратэгію ўстойлівага развіцця Магілёўскай вобласці на перыяд да 2035 года і аналагічныя стратэгіі раёнаў-удзельнікаў.

— Праект даказаў, што супрацоўніцтва паміж раёнамі выступае умовай устойлівага развіцця менавіта на сельскай тэрыторыі, — падкрэсліла каардынатар праекта Ірына Марціновіч. — Раёны аб'ядналіся, каб стымуляваць дзелавую актыўнасць на вёсцы, стварыць прывабныя магчымасці для жыхароў, даць шанц кожнаму чалавеку рэалізаваць свае здольнасці, эфектыўна спалучаючы ўнікальнасць, працавітасць і любоў да малой радзімы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# Выраслі мінімальны заробак, базавая велічыня і базавая стаўка

## «Мінімалка» вырасла да 457 рублёў

Нагадаем, што з 1 студзеня бягучага года мінімальная заработная плата ўстаноўлена ў памеры 457 рублёў. Адпаведнае рашэнне прынята пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 снежня 2021 г. № 721 «Аб устанаўленні памеру месячнай мінімальнай заработнай платы». Згодна з заканадаўствам, памер месячнай мінімальнай заработнай платы ўстанаўліваецца Саветам Міністраў па прапанове Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях.

Пры гэтым калектыўным дагаворам можа быць устаноўлены і іншы памер месячнай мінімальнай заработнай платы, але ён мусіць быць не ніжэйшы за ўстаноўлены заканадаўствам памер у 457 рублёў.

Тут важна ведаць, што памер пагадзіннай мінімальнай заработнай платы ў адпаведнасці з заканадаўствам вызначаецца наймальнікам. Гэта велічыня вылічваецца шляхам дзялення памеру месячнай мінімальнай заработнай платы на суадносіны разліковай нормы рабочага часу каляндарнага года, устаноўленай для адпаведных катэгорый работнікаў наймальнікам у адпаведнасці з заканадаўствам аб працы, і колькасці месяцаў каляндарнага года.

## Павысілася зарплата бюджэтнікаў

Памер заработнай платы ў бюджэтнікаў з пачатку гэтага года таксама вырас. З 1 студзеня 2022 года базавая стаўка павысілася да 207 рублёў (на 4,5%). Прынятае рашэнне закранае каля 850 тысяч работнікаў бюджэтнай сферы.

Патлумачым, што базавая стаўка (не блытаць з базавай велічынёй) — асноўны элемент тарыфнай сістэмы, на аснове якой праводзіцца аплата працы работнікаў бюджэтных арганізацый і іншых арганізацый, работнікі якіх прыраўнаваны па аплаце працы да работнікаў бюджэтных арганізацый.

— У 2021 годзе назіраўся апераджальны тэмп росту заработнай платы ў бюджэтнай сферы ў параўнанні з тэмпамі росту заработнай платы ў краіне: намінальны склаў 114,6 працэнта, рэальны — 104,8 працэнта. За студзень — кастрычнік 2021 года тэмп росту намінальнай налічанай заработнай платы работнікаў бюджэтных арганізацый у параўнанні з адпаведным перыядам 2020 года склаў 114,9 працэнта, рэальны тэмп росту — 105,1 працэнта, — прывялі лічбы ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

Гэта не адзінае сёлета павышэнне базавай стаўкі. Згодна з прагнозам асноўных параметраў сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2022 год, яе павелічэнне плануецца ў два этапы.

Ёсць і яшчэ адна прыемная навіна для работнікаў бюджэтнай сферы: з пачатку года з 0,5 да 1 аклада павялічваецца аднаразовая выплата на аздараўленне.

## Змянілася базавая велічыня

З 1 студзеня ў Беларусі змяніўся памер базавай велічыні — з 29 да 32 руб. Адпаведная пастанова Савета Міністраў прынята 31 снежня мінулага года.

Нагадаем: базавая велічыня ўплывае на колькасныя паказчыкі больш за 200 нарматыўных актаў. Прасцей кажучы, яна прымяняецца для зручнасці разліку некаторых відаў штрафаў, падаткаў, дзяржпошлін і выплат насельніцтву. У апошнія гады базавая велічыня змяняецца адзін раз на 12 месяцаў — з 1 студзеня.

Пры павелічэнні базавай велічыні прапарцыянальна мяняецца пошліна за выдачу новага пашпарта, жаніцьбу ці скасаванне шлюбу, выраслі штрафы за безбілетны праезд у транспарце, нецэнзурную лаянку або распіццё спіртных напояў у грамадскіх месцах, курэнне ў забароненых месцах. Змяніліся штрафы за перавышэнне хуткасці, няправільную паркоўку, адсутнасць тэхагляду і іншае.

Базавая велічыня таксама прымяняецца і ў сферы працоўных адносін. Таму ў сувязі з яе змяненнем выраслі некаторыя віды прэмій, стыпендый, матэрыяльная і грашовая дапамога асобным катэгорыям грамадзян і іншыя выплаты. Напрыклад, да базавай велічыні прывязаны памер дапамогі па беспрацоўі.

**Алена КРАВЕЦ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Турызм

# ПУНКТЫ ПРЫЦЯГНЕННЯ,

## або Хто адкрывае Беларусь

**Падведзены вынікі галоўнага турыстычнага конкурсу «Пазнай Беларусь». Сярод яго задач — стварэнне станоўчага іміджу Рэспублікі Беларусь, прыцягненне насельніцтва да актыўнага спосабу жыцця, папулярызацыя спадчыны і заахвочванне гульцоў турыстычнай індустрыі. Да яго далучаюцца санаторыі, аграсядзібы, музеі, турыстычныя кампаніі, экскурсаводы, атэлі, базы адпачынку; прадстаўнікі творчых прафесій, дзеці і моладзь. Конкурс ладзіцца з 2002 года. Летась была пададзена рэкордная колькасць заявак — 1355 у 13 намінацыях. Такая папулярнасць XIX рэспубліканскага галіновага конкурсу сведчыць пра тое, што, нягледзячы на складаную эпідэмічную сітуацыю, беларусы працягваюць падарожнічаць і адкрываць для сябе раней неспазнаныя гарады і мястэчкі, іх культуру і гісторыю. Так, толькі на намінацыю «Я пазнаю Беларусь», дзе выбіраюцца самыя актыўныя падарожнікі, паступіла 154 заяўкі.**

Эфектыўна спрацавалі санаторыі, ім нават удалося прыняць гасцей больш, чым у даволі ўдалым, даковідным 2018 годзе. Менавіта медыцынскі, а таксама паляўнічы турызм у нашай краіне, нягледзячы на пандэмію, увесь гэты час працягваў працаваць без такіх сур'ёзных каранцінных абмежаванняў, як у іншых краінах. Але сёння, каб атрымаць званне найлепшага санаторыя краіны, установам ужо недастаткова проста прадставіць лічбы па запаўняльнасці. Сярод крытэрыяў, на якія звяртала ўвагу журы, — удзел у выстаўках і прэзентацыях, адукацыйных праграмах, рэкламна-інфармацыйных мерапрыемствах, кваліфікацыя супрацоўнікаў, даступнасць для асоб з інваліднасцю. Не менш жорсткімі былі патрабаванні пры выбары атэляў, аграсядзіб, турыстычных кластараў.

Як заўважыў **намеснік міністра спорту і турызму Міхаіл ПАРТНОЙ,** конкурс дазваляе па працягу года вызначыць найбольш крэатыўных прадстаўнікоў турыстычнай галіны, якія жывуць сваёй справай і нават у складаны час прасоўваюць цікавыя ідэі.

Для Беларусі пандэмія стала часам пераасэнсавання сваіх набыткаў, пошуку новых падыходаў, павышэння кваліфікацыі (калі рыхтаваліся экскурсаводы і гіды-перакладчыкі), стварэння разнастайных унутраных маршрутаў.

Знаёмства з адзначанымі журы ўдзельнікамі конкурсу — арыенцір для будучых вандровак. Шмат хто ўжо паспеў пабываць у Міры, але ці зазіралі вы ў невялікі прыватны музей «Мірскі пасад»? Згаданая ўстанова працуе ўжо 13 гадоў, у ёй можна даведацца цікавыя факты з жыцця гарадскога пасёлка, яўрэйскай гісторыі. Тут нават ёсць рэчы з Мірскага замка. Справа ў тым, што ў самім замку людзі жылі сем'ямі ў пасляваенныя гады, перазджаючы адтуль, некаторыя прадметы, з якімі замкавыя «кватаранты» ўжо зжыліся, яны забіралі з сабой, а сёння некаторыя з тых рарытэтаў могуць выстаўляцца на продаж. Цэны на іх немалыя, але гаспадар невялікага «Мірскага пасада» па магчымасці стараецца іх выкупляць, каб праз энергетыку гэтых рэчаў перадаць наведвальнікам гісторыю гарадскога пасёлка.

Гаспадар аграсядзібы і музея «Мірскі пасад» Віктар Сакель шчыра прызнаецца: вельмі прыемна, што зробленую ім работу заўважылі. Для яго адкрыццё такога пазнавальнага праекта стала ажыццяўленнем мары, бо гісторыяй ён захапляўся яшчэ са школы. Маленькі, але вельмі змястоўны музей — гэта цудоўная магчымасць дзяліцца сваімі адкрыццямі і вучыць людзей захапляцца асяроддзем, у якім яны жывуць. Музей пачаў карыстацца папулярнасцю не толькі месцічаў, сюды прывозяць групы турыстычныя кампаніі. Гасцям падабаецца, што любую рэч можна патрымаць у руках, сфатаграфавацца з ёй, ад чаго ў асаблівае захапленне прыходзяць дзеці (сярод наведвальнікаў тут бываюць і выхаванцы дзіцячых садкоў). Віктар Янавіч упэўнены, што музеі спрыяюць папулярызацыі гарадоў і мястэчак. І гарадскому пасёлку не пашкодзіць, калі такіх устаноў будзе пяць ці шэсць. Кожная з іх будзе дапамагаць адкрываць мясціну з новага боку — як праз рэчы, так і праз веды і погляды людзей, што там будуць працаваць.

Сапраўды, у апошнія гады менавіта дзякуючы такім ідэям унутраны турызм пачаў актыўна развівацца. Работнікі музеяў, экскурсаводы і гаспадары сядзіб ствараюць тое, чаго раней не было, альбо ўдыхаюць новае жыццё ў забытыя традыцыі. Менавіта з іх захапленняў у многіх турыстаў вырастае цікавасць да Беларусі.

Гаспадар аграсядзібы «Стары шлях» Аляксандр Дударэнка прапануе гасцям сон... на пчаліных вуллях. І запэўнівае, што апітэрапія (у прыватнасці, лячэнне з дапамогай укусаў пчол) — гэта не выдумка. Усур'ёз заняўца пчоламі ён вырашыў, каб дапамагчы сваёй маці, і ў жанчыны сапраўды перасталі балець каленныя суставы. У вясковым медыцынскім турызме ён зусім нядаўна. І развіваць сваю справу пачаў на аснове хаты яго дзеда з бабай, якая стаіць на Старым шляху. Так месцічы называюць дарогу, што ішла на Брэст, да таго, як праклалі «бетонку».

Яшчэ адзін старадаўні шлях — Ігуменскі тракт — аблюбавалі гаспадары новага кластара прысталічча. Адна з яго ўдзельнікаў Ларыса Хмяльніцкая прыкладае шмат намаганняў, каб паказаць, наколькі цікавым можа быць падарожжа па Ігуменскім тракце, рыхтуе маршруты, шукае новыя аб'екты, якія могуць далучацца, каб вандроўка станавілася яшчэ больш насычанай, разнастайнай. З кожным годам маршрут будзе прырастаць новымі пунктамі прыцягнення. Ужо сёння ён аб'ядноўвае з дзясятак творчых асоб. І менавіта людзі — галоўная адметнасць маршруту, бо кожны чалавек прыўносіць свае ідэі, крэатыў, уменні. А ў постковідным турызме зносіны і эмоцыі становяцца важным складнікам у аграэкатурызме. Сёння вандроўнік у прысталічны можа даведацца больш пра кавальства ці рыцарскую тэматыку, далучыцца да аматараў актыўнага, экалагічнага спосабу жыцця. Натуральна, у гэтыя святочныя дні тут рыхтуюць святочныя праграмы.

Адна з сядзіб, якая развівае турызм Міншчыны, — «На славу». Гэта сямейны праект, дзе гаспадары дзеляцца сваімі ўменнямі. Таму і чакаюць тут менавіта сямейныя групы (і нават карпаратывы раюць адзначаць са сваімі палавінкамі і дзеткамі). Разьбярства, кулінарныя майстар-класы, ферма са слімакамі — далёка не ўсе цікавінкі ад гаспадароў.

Сярод адзначаных мясцін адпачынку — сядзіба Дудзіка (вёска Залахвенне, Быхаўскі раён), «Утрына» (Маргі, Глыбоцкі раён), «У хутарской цішы» (Вішневічы, Ваўкавыскі раён), «Краіна мар» (Хралы, Глыбоччына), «Дранікләнд» (Церуха, Гомельскі раён), кластары «Церам забаў» (Шчучынскі раён), «Сырны» (Слаўгарадскі раён).

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**




**Музей «Мірскі пасад» у параўнанні са славутым замкам выглядае вельмі сціпла, але ў ім шмат цікавага.**



Яўгена ПЯСЕЦКАГА

фота слова

*Ніхто не ведае, адкуль яны ляцяць —*
*Сняжынкі незлічонай чарадой:*
*Ці з шэрых хмар над хатаю маёй,*
*Ці стуль, дзе зоркі ў бездані*
*мігцяць.*

*Нікому з нас дазнацца не ўдалось,*
*Адкуль паходзіць тое хараство...*
*Напэўна, там, сярод галактык,*
*ёсць*
*Для ўсіх снягоў спрадвечнае*
*жытло.*

*Напэўна, там, калі стварыўся Свет,*
*Стаў белы снег найпершым,*
*што было.*
*Бязгрэшны, беззаганны*
*першы снег,*
*Чысцюткі, як анёлава крыло...*

*Вось гэтак ён ад тых часоў ідзе,*
*Ад першых дзён у наш*
*сучасны век.*
*Каб на Зямлі было яшчэ святлей,*
*Кружляе і кладзецца*
*белы снег.*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Інфляцыя ў Еўропе дасягнула гістарычнага максімуму



Гадавая інфляцыя ў 19 краінах еўразоны ў снежні паскорылася да 5 %, вынікае са звестак Еўрастата. Гэта максімальны ўзровень з моманту ўвядзення адзінай валюты ў еўразоне, паведаміла Financial Times. Мінулы рэкорд інфляцыя ў Еўропе паставіла ў лістападзе, дасягнуўшы 4,9 %. Як адзначае Reuters, рэзкі скачок стаў нечаканасцю для аналітыкаў, якія чакалі запаволення інфляцыі да канца 2021-га да 4,7 %. Пры гэтым у снежні 2020 года ў еўразоне была зафіксавана дэфляцыя 0,3 %. Асноўным драйверам росту цэн у Еўропе застаюцца энерганосьбіты, кошт якіх у мінулым месяцы ўзляцеў на 26 % у гадавым выражэнні. Зрэшты, рост цэн на прадукты харчавання, паслугі і імпартныя тавары таксама значна перавысіў агульны мэтавы паказчык Еўрапейскага цэнтральнага банка (ЕЦБ) у 2 %, паведаміла Reuters. Лідарамі па інфляцыі ў снежні сталі Эстонія (12 %), Літва (10,7 %) і Латвія (7,7 %).

### У Туркменістане патушаць «Браму пекла»



Прэзідэнт Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедаў распарадзіўся спыніць уцечку і ўзгаранне газу ў кратары, які ўтварыўся ў рэгіёне Дарваза ў 1970-я гады, паведаміла агенцтва «Азертадж». «Нягледзячы на тое, што газавы кратар стаў папулярным у турыстаў, газ, які згарае ў ім, наносіць шкоду навакольнаму асяроддзю і ўплывае на здароўе. Згаранне блакітнага паліва прыводзіць да парніковага эфекту, які з'яўляецца адной з прычын глабальнага пацяплення», — адзначаецца ў паведамленні. На пасяджэнні ўрада туркменскі лідар даручыў прыняць меры для прадухілення ўзгарання. Да гэтай работы будуць прыцягнуты вучоныя. Раней газавы кратар атрымаў афіцыйную назву «Зззянне Каракумаў». Мясцовыя жыхары і турысты часта называюць яго «Дарваза», а ў замежных даведніках замацавалася назва «Брама пекла». Ён утварыўся ў 1971 годзе пасля абвалу падземнай пустаты пры свідраванні. Каб прадухіліць экалагічную катастрофу ад выкідаў таксічных газаў, геолагі вырашылі іх падпаліць. Па разліках, агонь павінен быў згаснуць праз некалькі тыдняў, аднак кратар дыяметрам каля 70 метраў працягвае гарэць дагэтуль.

Прававая гасцёўня

# АДМОВІЦЦА НЕЛЬГА СПАГНАЦЬ АЛІМЕНТЫ



**Нараджэнне дзіцяці — далёка не заўжды свята для бацькоў, асабліва калі яны яшчэ і не жывуць разам, а каб выгадаваць малога, даводзіцца спаганяць з другой паловы аліменты. Як дзейнічаць і на што разлічваць у пэўных сітуацыях, расказала Алена ШМАНАЙ, адвакат Мінскай калегіі адвакатаў.**

## Дзіця ад каханка запісалі на былога мужа

**— Я шматдзетная маці траіх дзяцей 15, 9 і 1,5 гадоў. З былым мужам мы не жылі разам каля чатырох гадоў, аднак не разводзіліся. У той час у мяне былі адносіны з іншым, і я зацяжарыла. Падала на скасаванне шлюбу, і нас развялі. Аднак калі я сабралася рэгістраваць дзіця, аказалася, што былы муж павінен напісаць адмову, паколькі з моманту разводу не прайшоў патрэбны час. Былы сужэнец адмовіўся прыйсці ў ЗАГС, і дзіця аўтаматычна запісалі на яго. Цяпер жа біялагічны бацька майго малодшага дзіцяці не хоча ўдзельнічаць у яго выхаванні ні матэрыяльна, ні фізічна. Хачу падаць заяву на аліменты ад яго. Аднак першы муж усё роўна не хоча ісці ў суд, каб зняць з сябе запіс аб дзіцяці. Як мне спагнаць аліменты на ўтрыманне?**

**Юля П.**, *г. Расоны.*

— Сапраўды, згодна з законам (артыкул 51 Кодэкса аб шлюбе і сям'і, далей — Кодэкс), нараджэнне дзіцяці ў замужняй жанчыны аўтаматычна робіць бацькам яе мужа. Запіс пра гэта робіцца на падставе акта аб заключэнні шлюбу. Бацькам дзіцяці, якое нарадзілася на працягу дзесяці месяцаў пасля скасавання шлюбу або прызнання яго несапраўдным, таксама вызначаецца былы муж маці немаўляці.

Паходжанне дзіцяці ад бацькі, які не пабіраўся шлюбам з маці малога, вызначаецца на падставе сумеснай заявы маці і бацькі дзіцяці аб рэгістрацыі ўстанаўлення бацькоўства, якая падаецца ў органы ЗАГС, або рашэння суда аб устанаўленні бацькоўства.

Паходжанне дзіцяці ад бацькі, які не пабіраўся шлюбам з маці малога, калі тая замужам за іншым, таксама вызначаецца на падставе сумеснай заявы бацькі і маці малога аб рэгістрацыі ўстанаўлення бацькоўства, якая падаецца ў органы ЗАГС, або рашэння суда аб устанаўленні бацькоўства. Аднак у гэтым выпадку патрэбныя яшчэ заява маці, у якой яна пацвярджае, што яе муж не з'яўляецца бацькамі дзіцяці, а таксама заява мужа маці дзіцяці аб тым, што ён не з'яўляецца бацькам малога.

Бацькоўства можа быць устаноўлена па судзе, згодна з артыкулам 57 Кодэкса, калі бацькі дзіцяці не пабраліся шлюбам паміж сабой і не прадаставілі ў органы ЗАГС заявы, якія прадугледжаны часткамі 5 і 6 артыкула 51 Кодэкса. А таксама калі звесткі аб бацьку малога ў запіс акта аб нараджэнні ўнесены ў адпаведнасці з артыкулам 55 Кодэкса. Пры вызначэнні бацькоўства суд прымае да ўвагі доказы, якія дакладна пацвярджаюць паходжанне дзіцяці ад меркаванага бацькі, або прызнанне меркаваным бацькам дзіцяці. Суд таксама можа прыняць да ўвагі моманты, калі маці дзіцяці і меркаваны бацька сумесна выхоўваюць або ўтрымліваюць малога або сумесна жывуць і вядуць агульную гаспадарку да нараджэння дзіцяці.

Згодна з артыкулам 58 Кодэкса, запіс аб бацьках мае права аспрэчыць па судзе асоба, якая ўказана ў запісе акта аб нараджэнні ў якасці бацькі ці маці дзіцяці. Зрабіць гэта можна на працягу года з моманту, калі ім стала або павінна было стаць вядома аб здзейсненым запісе ці абставінах, якія выключаюць факт бацькоўства ці мацярынства.

Вам трэба звярнуцца ў суд з іскавай заявай з трыма патрабаваннямі: аб аспрэчванні бацькоўства (у дачыненні да былога мужа), аб устанаўленні бацькоўства, а таксама аб спагнанні аліментаў (у дачыненні да біялагічнага бацькі вашага дзіцяці). Падчас судовага разгляду судом будуць прызначаны генетычныя экспертызы, якія ў тым ліку стануць доказамі па справе.

## Грошы наперад і за мінулае

**— Былы муж выплачвае на нашага сумеснага малога аліменты ў памеры, які вызначаны дзяржавай. Аднак плаціць ён не ў пэўны дзень месяца, а калі захоча. Акрамя таго, я падазраю, што апошнім часам яму павялічылі заробак. Ці павінен ён плаціць грошы ў дакладны час і ці можна зрабіць пераразлік сумы, калі ў былога мужа павялічыўся заробак? Хацелася б яшчэ даведацца, ці можна атрымаць аліменты наперад на выпадак, калі ён раптам пазбавіцца работы?**

**Галіна К.**, *г. Касцюковічы.*

— Згодна з заканадаўствам, на адно дзіця плацельшчык павінен выдаткоўваць суму ў 25 % ад свайго заробку, на двух — 33 %, на трох і болей малых — 50 % свайго даходу. Пры гэтым для працаздольных бацькоў мінімальны памер аліментаў у месяц павінен складаць не менш за 50 % бюджэту пражытковага мінімуму, на двух — 75 %, на трох і болей — 100 %.

Аліменты выплачваюцца да апошняга дня месяца, які ідзе за бягучым. Напрыклад, аліменты за лістапад павінны быць выплачаны не пазней за 31 снежня. Запазычанасць па аліментах разлічваецца са дня ўзбуджэння выканаўчага вядзення. Калі грошы не плаціліся доўгі час, а справа не была заведзена, то па хадайніцтве заяўніка суму запазычанасці можна налічыць і за папярэдні перыяд, аднак не больш як за тры гады.

Атрымаць аліменты наперад таксама магчыма. Для гэтага павінна быць узбуджана выканаўчае вядзенне, прысутнічаць заява патрабавальніка грошай, а сам даўжнік — не працаваць і не мець заробку ці іншага віду даходу. У заяве спагнанніка павінна быць абазначана: перыяд, на які ажыццяўляецца выдача аліментаў, абгрунтаванне разліку выплачваемых на будучы час сум. Калі абазначаны ў заяве перыяд скончыцца, а таксама па заяве спагнанніка доўгу судовы выканаўца ўстанаўлівае памер аліментаў, якія павінны былі быць выплачаны даўжніком, і пры неабходнасці пераразлічвае запазычанасць па аліментах. Калі за мінулы час аліменты павінны былі выплачвацца ў меншым памеры адносна памеру, які ў заяве ўказаў патрабавальнік, перагляд сум за гэты час не робіцца, і грошы даўжніку не вяртаюцца.

*Шаноўныя чытачы, у выпадку ўзнікнення пытанняў юрыдычнага характару дасылайце іх на наш электронны адрас joyyya@gmail.com. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста і іншых устаноў мы будзем шукаць адказы.*

Дзіцячы свет

# Зімовы летнік

**Віцебскі абласны палац дзяцей і моладзі арганізаваў зімовую змену ў сваім аздараўленчым лагеры «Дружныя дзеці».**



Лагер знаходзіцца за пяць кіламетраў ад абласнога цэнтра на беразе ракі Заходняя Дзвіна. «Навагодняя казка ў «Дружных дзецях» — такая назва першага ў 2022 годзе заезду. Весела і з карысцю правялі гэтыя дні каля васьмідзесяці дзяцей і падлеткаў ва ўзросце ад 8 да 15 гадоў. Кожны дзень ім прапаноўваўся ўдзел у цікавых мерапрыемствах. Напрыклад, у забаўляльнай праграме «TikTok», гумарыстычным шоу «Хто лепшы важаты?», флэшмоб-конкурсе «Марозны DANCE-2022», інтэлектуальным брэйн-рынгу. Можна было таксама адзначыць Новы год разам з рознымі краінамі свету, паўдзельнічаць у інтэрнэт-чэленджы «Найлепшыя канікулы — у «Дружных дзецях». Вельмі зацікавіла школьнікаў магчымасць узяць удзел у конкурсе мабільнага кіно «У ноч на Раство». Сярод крэатыўных падзей — шоу-праграма «Там, дзе нараджаюцца Снягуркі», краязнаўчы квэст і многае іншае.

У "зімовым летніку" арганізавана пяціразовае харчаванне, але самае галоўнае — дарослыя імкнуцца стварыць для дзяцей тут казачны настрой, умовы для развіцця і гарантуюць бяспеку.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жатерево» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже:**

**ЗДАНИЯ ПИЛОРАМЫ**

***(составные части и принадлежности: вход в подполье)***

**с инвентарным номером № 622/С-42992 общей площадью 352,2 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625481302101000152 (право аренды по 19.05.2063) площадью 0,1984 га по адресу: Минская область, Столбцовский район, Вишневецкий с/с, аг. Горки, ул. Первомайская, 2В.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **22 624,05** бел. руб.
*Начальная цена снижена на 20 %.*
Задаток 10 % от начальной цены – **2 262,41** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере: 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 30.07.2021.

Аукцион состоится **26.01.2022** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.01.2022** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра (8029) 138-01-12.**

УНН 600014432


Надвор'е

# МАРОЗ ЗА ВУШЫ КУСАЕ

На гэтым тыдні сіноптыкі абяцаюць да мінус 24 градусаў

**Другая дэкада студзеня адзначаецца па-сапраўднаму зімовым надвор'ем. У гэты час на тэрмометрах назіраюцца адмоўныя значэнні тэмпературы, а на раніцу 10 студзеня ў многіх раёнах краіны было зафіксавана снежнае покрыва вышынёй ад 1 сантыметра да 15 сантыметраў, месцамі па ўсходзе краіны — да 18—26 сантыметраў. Самыя высокія гурбы (да 29 сантыметраў) былі на метэастанцыі Мсціслаў. А ў найбліжэйшыя дні маразы ўзмоцняцца, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння месцамі па краіне чакаецца невялікі снег, слабы туман і шэрань. На асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўночны слабы з узмацненнем да ўмеранага. Тэмпература паветра па працягу сутак складзе ад мінус 5 па захадзе да 14 марозу па паўночным усходзе. Удзень у паўднёва-заходніх раёнах будзе 2—4 градусы ніжэй за нуль.

А вось у сераду — пераважна без ападкаў, толькі месцамі па паўднёвым усходзе краіны пройдзе невялікі кароткачасовы снег. На асобных участках дарог — галалёдзіца. Вецер прагназуецца няўстойлівы слабы з узмацненнем да ўмеранага. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 8 градусаў па паўднёвым захадзе да 18 марозу па паўночным усходзе краіны, месцамі — мінус 19—24 градусаў. Удзень будзе ад мінус 3 градусаў па паўднёвым захадзе да 15 марозу па ўсходзе.

Аднак па-сапраўднаму марознае надвор'е пратрымаецца ў нас нядоўга. У другой палове тыдня чакаецца змяненне прыродных умоў. Тэрыторыя Беларусі апынецца ва ўладзе атмасферных франтоў з Заходняй Еўропы, за якімі пачне паступаць цёплае паветра атлантычнага паходжання. Маразы зменяцца адлігамі, ападкі са снегу будуць пераходзіць у мокры снег з дажджом. А гэта можа стаць прычынай галалёдных з'яў.

У чацвер на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе кароткачасовы снег, удзень ён будзе пераходзіць у мокры снег і дождж. Удзень месцамі магчымы галалёд, слабы туман. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Вецер заходні парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 7 да 15 марозу, па паўднёвым захадзе — мінус 5—6 градусаў, па ўсходзе — 16—23 марозу. Удзень будзе ад мінус 3 градусаў да плюс 3, па ўсходзе — да 6 градусаў ніжэй за нуль.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, ужо ў пятніцу пацяплее амаль паўсюдна. У гэты дзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. У асобных раёнах чакаецца слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Месцамі магчыма ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 6 градусаў па ўсходзе да плюс 3 па захадзе, удзень — ад нуля да 6 цяпла.

Праўда, на наступны дзень надвор'е абвесціць, што вялікага цяпла адліга не прынесла. У суботу на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ўжо ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. Месцамі чакаецца слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. У асобных раёнах краіны магчыма ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла, удзень — ад мінус 3 да плюс 3 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**


**Внеочередное общее собрание акционеров**

ОАО «Молодечненский ЗЖБИ»

состоится **21.01.2022** года в **15 часов 00 минут** по адресу: г. Молодечно, ул. Элеваторная, д. 1 (кабинет директора).

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, назначена на **18.01.2022**.

ВОПРОСЫ ПОВЕСТКИ ДНЯ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ:

1. Об утверждении передаточного акта.

Порядок регистрации участников внеочередного общего собрания акционеров: 21.01.2022 с 14.30 до 15.00 по месту проведения внеочередного общего собрания акционеров на основании документа, удостоверяющего личность (паспорт), для представителя акционера – паспорт и документ, подтверждающий полномочия (доверенность).

Общее собрание участников ООО «Молодечненский ЗЖБИ» состоится **21.01.2022** года в **16 часов 00 минут** по адресу: г. Молодечно, ул. Элеваторная, д. 1 (кабинет директора).

ВОПРОСЫ ПОВЕСТКИ ДНЯ ОБЩЕГО СОБРАНИЯ УЧАСТНИКОВ:

1. Об утверждении новой редакции устава ООО «Молодечненский ЗЖБИ»;

2. Об образовании органов управления и контроля ООО «Молодечненский ЗЖБИ» и избрании их членов.

Предложения участников о выдвижении кандидатов в органы управления и контроля ООО «Молодечненский ЗЖБИ» могут быть предъявлены не позднее 13.01.2022 в письменном виде по месту проведения общего собрания участников. Перечень информации к общему собранию участников, включающий сведения о выдвинутых кандидатах в органы управления и контроля, будет доступен для ознакомления с 11.01.2022 в месте проведения общего собрания участников в будние дни с 08.15 до 16.45.

Порядок регистрации лиц, прибывших для участия в общем собрании участников ООО «Молодечненский ЗЖБИ»: 21.01.2022 с 15.45 до 16.00 по месту проведения общего собрания участников на основании документа, удостоверяющего личность (паспорт), для представителя участника – паспорт и документ, подтверждающий полномочия (доверенность).

УНП 600136965

# ХТО ТЫ МНЕ?..

## Што самае складанае ў доглядзе ляжачых хворых

**Гэта можа здарыцца ў любой сям'і. Ніхто не ведае наперад, але аднойчы блізкі чалавек можа аказацца прыкаваным да ложка. З розных прычын. У розных абставінах. З надзеяй на аднаўленне ці не — залежыць ад дыягназу. Гаворка не пра хваробы. Гаворка пра тое, як спраўляецца сям'я з гэтым становішчам і як можа падтрымаць таго, чый лад жыцця змяніўся кардынальна і, магчыма, назаўсёды. Чалавека выпісваюць з медыцынскай установы, і пачынаецца шлях, на якім вы знаёміцеся наноў і мусіце адкрыць крыніцы бязмежнай любові, без якой немагчыма існаванне наогул. Хутчэй за ўсё, вы не захочаце пра гэта шмат гаварыць, а будзеце маўчаць, бо той, хто шукае клад, робіць гэта таемна. Таму што адна справа — сказаць: «Мы даглядаем хворую маму», а зусім іншая — «Мы вучымся любіць». Першае без другога будзе праўдай толькі напалову.**

Віншаванні ды падарункі на святы, размовы па тэлефоне ў вольны час, паездкі да бацькоў у адпачынак, пацалункі, усмешкі, маміны слязінкі на ад'езд. Усё было як ва ўсіх. Але калі пасля інсульту ў выпісным эпікрызе значыцца: «поўная страта асобы», то знаёміцца прыходзіцца наноў, вучыцца любіць наноў і ёй, і нам — чалавека, які аказаўся бездапаможны і цяпер цалкам залежыць ад іншых.

— Прывітанне! Як цябе клічуць? А мяне? Хто я табе? А ты мне?.. — з таго часу я кожны дзень задаю ёй гэтыя пытанні. Тады ў яе не атрымалася сказаць, але падалося, што недзе ў глыбіні душы яна ведала адказы.

Аказалася, што ў бездапаможнасці шмат аблiччаў. Усё залежыць ад ментальнага стану. Адна справа — чалавек, які можа ўсё сказаць і патлумачыць, зусім іншая — калі гэтага няма. Урачы былі скептычныя ў тым, ці зможа мама калі-небудзь размаўляць і наогул аднавіцца. Заставалася гнаць далей гэтыя думкі, бо тады вельмі складана не апусціць рукі (а права на гэта няма) і выконваць усе рэкамендацыі.

**Калі вы думалі,
што цярплівасць —
не самая моцная ваша рыса,
то прыйдзецца паглядзець
на сябе іншымі вачыма.
Цярплівасць — ваша другая
сутнасць, калі жыццё
падпарадкаванае дарагому
чалавеку.**

Тут адразу з'яўляецца нюанс. Таму што рэкамендацыі па леках і рэжыме даюць хворым. Але не даюць рэкамендацый іх родным, якія пакуль не разумеюць, што залежыць ад іх і як яны цяпер павінны змяніць сваё жыццё. Так, нейкія рухі падказвае элементарная логіка. Да чагосьці мы даходзілі самі. А штосьці падглядзелі ў рэабілітацыйным цэнтры.

Пасля інсульту чалавеку патрэбна рэабілітацыя, гэта прадугледжана дзяржавай. Але гарантаванай медыцынскай рэабілітацыяй мы вырашылі не абмяжоўвацца. Для нас было істотна, каб абудзіць імкнуліся не толькі цела, але і душу, каб да мамы маглі хадзіць святары — яна заўсёды верыла ў Бога. І аднойчы я назірала ў Цэнтры міласэрнасці, дзе стацыянары стасуюцца з храмам: калі да мамы прыйшоў святар і памазаў алеем лоб, яе твар асвяціла ўсмешка. Ні на кога яна так не рэагавала, нават на нас, дачок. А пасля я ў калясцы павезла яе на нядзельнае богаслужэнне. Пры першых жа гуках мама заплакала, слёзы не сціхалі, пакуль мы не вярнуліся ў палату. Гэта была яе маўклівая малітва. Акрыяла надзея: здавацца нельга найперш нам. Праўда, складана не згубіць надзею ў віры штодзённых клопатаў, якія да таго ж ідуць з пераменным поспехам.

Перад выпіскай дадому найперш трэба было рыхтаваць ложак. Цяпер няма праблем, каб набыць адмысловыя прылады для ляжачых хворых: ад пад'ёмнікаў, каб перасаджваць чалавека ў каляску, да спецыялізаваных медыцыйнскіх ложкаў. Іх варыянтаў безліч ад рэгуляваных да больш сціплых, але з адкіднымі борцікамі, каб чалавек не падаў. На любы бюджэт, у тым ліку па даступных цэнах — усё можна заказаць праз інтэрнэт нават з дастаўкай у любы пункт Беларусі. Ды матрацы супраць пролежняў таксама ў розных варыянтах. Патрэбнае я ўзяла на пракат у Мінску — было спадзяванне, што наша сітуацыя часовая. Перад вачыма быў прыклад суседкі па палаце. На нашых вачах за паўтара месяца Валянціна паступова ператварылася з ляжачай у сядзячую і нават навучылася перасоўвацца з хадункамі, і ўсё сама, бо дзеці былі ў іншай краіне, а яна моцна хацела вярнуцца дадому, дзе дапамогі не будзе.

Ішоў час, і аднойчы тата сказаў, што яны паедуць дадому. Да родных сцен. Спрачацца было немагчыма. Ён меў рацыю: як толькі каляска перасекла парог роднай хаты, наша матулька пачала азірацца па баках і радасна ляментаваць. Ніякія бальніцы і самыя сучасныя рэабілітацыйныя цэнтры з добрым доглядам, ні дзеці з іх моднымі кватэрамі на высокіх паверхах не заменяць вось гэтага адчування свайго месца, дзе прайшло ўсё жыццё, дзе кожны кавалак падлогі, кожная рэч прасякнутая энергіяй гаспадароў і гатовая яе вяртаць з лішкам, як аказалася. Дзецям бывае складана прыняць выбар бацькоў.

**Найбольш складана
для блізкіх — знайсці
крыніцу веры і не адыходзіць
ад яе, не спакушацца
на ляноту, на «потым»,
на «як ёсць».**

Тата сам прыстасаваў мамін ложак пад яе новы стан: ножкі ад колішняй раскладушкі ператварыліся ў здымныя поручні — каб яна магла адпачываць як каралева, і не прыходзілася перажываць, што ўпадзе. Ад медыцынскага ложка і нават матраца супраць пролежняў вырашылі свядома адмовіцца — яны насамрэч настолькі зручныя, што ёсць спакуса пакінуць маму ў спакоі, не напружвацца самім і яе лішні раз не варушыць, не ўздымаць, не садзіць, карміць у ложку, тут жа ўмываць ды гігіенічныя працэдуры рабіць. А менавіта гэта шлях да спрашчэння нашага і яе ляноты ў выніку, што зусім не спрыяла рэабілітацыі і аднаўленню. Напрыклад, як здарылася з Нінай. З ёю я сутыкнулася ў бальніцы, куды жанчыну прывезла хуткая.



eparhia-saratov.ru

Чатыры гады пасля інсульту ляжыць. Розум працуе, размаўляе, што ад пачатку дае прагноз на паспяховае аднаўленне, але... Яна не ходзіць і нават сама не паварочваецца ў ложку. Ніна прымусіла ўсіх медсясцёр у аддзяленні завіхацца вакол сябе — а жанчынка не маленькая. Дома ў яе ложак з сегментамі, якія рэгулююцца, лепшы, чым у бальніцы. Паклапацілася дачка, што даглядае матулю: корміць, мые, варочае, што яшчэ трэба?.. Складана бывае зразумець: шмат чаго акрамя гэтага.

Трэба сказаць, што калі перад вамі стаяць задачы па дапамозе нямогламу чалавеку, то ўсё аказваецца цалкам вырашальным. Калі вы думаеце пра гэта шмат і скіраваныя на вынік, то і розум актывізуецца, творча працуе, і рукі не лянуюцца. Яшчэ з падгледжанага ў рэабілітацыйным цэнтры: маму спрабавалі навучыць стаяць — у адмысловай тумбе-вертыкалізатары. Купіць штосьці падобнае для нас было нерэальна (пры тым, што прапановы такіх прылад ёсць). «Я магу змайстраваць сам», — запэўніў тата. У яго тумбе ўсё аказалася прадумана: пад'езд і ўздым з каляскі, рост, абхват, каб мама стаяла шчыльна да спінкі, нават мяккія падлакотнікі. А яшчэ займелі трэнажор для рэабілітацыі — веласіпедныя педалі, якія дапамагаюць распрацоўваць ногі і рукі. Справа ў тым, што калі вы апынаецеся дома, то ўзнікае думка, што рэабілітацыя скончана, можна на гэтым спыніцца. Тут трэба зразумець: гэты працэс будзе працягвацца ўвесь час, толькі цяпер трэнерамі становіцеся вы. Прыйдзецца асвоіць новы навык. І пагадзіцца з тым, што ваш фітнес цяпер у трэніроўках іншага чалавека — насамрэч на гэтым можна спаліць шмат калорый, бо вы ўвесь час у руху: засвойваеце тэхнікі, як перакласці нерухомага, як пасадзіць, узняць у гару і паставіць на ножкі ды перасадзіць у каляску чалавека, які важыць больш, чым вы (дзякуй інтэрнэту, дзе можна паглядзець відэа, як правільна гэта рабіць). Але і мама ў руху: зразумеўшы, што нам цяжка, яна хоць трошкі, але імкнецца напружвацца, здаровай рукой сама можа есці за сталом разам з усімі, сама варочаецца, і ў нас няма нічога блізкага да пролежняў. Відавочна, ёй падабаецца вяртаць хоць малыя прыкметы здаровага жыцця, падабаецца, калі важныя для сям'і моманты абмяркоўваюцца пры ёй — актыўна рэагуе і вачыма, і ўсмешкамі, і гукамі. Нават словамі.

— Як тваё імя? А маму тваю як звалі? А тату?.. — з дня ў дзень мы спрабуем аднавіць страчаную інфармацыю і вучымся вымаўляць словы. Хутчэй запамінаем і вывучаем іх наноў. Калі вы думалі, што цярплівасць — не самая моцная ваша рыса, то прыйдзецца паглядзець на сябе іншымі вачыма. Цярплівасць — ваша другая сутнасць, калі жыццё падпарадкаванае дарагому чалавеку.

**Складана не згубіць
надзею ў віры штодзённых
клопатаў, якія да таго ж ідуць
з пераменным поспехам.**

Мы стараемся не называць маму хворай — прынялі, што цяпер яна знаходзіцца ў асаблівым стане, калі ёй патрэбная дапамога. Дапамога пастаянная, кругласутачная па магчымасці — і нейкі час вы жывяце цалкам яе жыццём, без права на разняволенне. Уся сям'я гуртуецца вакол адной задачы. Няма больш нічога, ніякіх падзей, ніякіх людзей навокал, вы фактычна адмяняеце ўласнае жыццё. І ў гэтым вялікая памылка, як бы гэта дзіка ні гучала: у кожнага з нас свой лёс. А ў такой сітуацыі, асабліва калі доўгі час няма відавочнага прагрэсу, ёсць рызыка ўпасці ў дэпрэсію і абрасці шэрагам уласных болек. Хто тады будзе ёй дапамагаць наогул? Берагчы сябе — гэта адна з галоўных задач блізкіх ляжачага хворага, вельмі няпростая для выканання. Бо ёсць не толькі любоў, але і сумленне, якое пастаянна трымае ў тонусе: трэба клапаціцца пра бацькоў. Безумоўна, трэба, але клопат можа быць розны. Можна знаходзіцца ў палоне стэрэатыпаў, але не быць пры гэтым карысным. Правільна размяркоўваць свае сілы і вызначаць прыярытэты — таксама клопат пра бацькоў, але пакуль атрымаецца гэта наладзіць, можа здарыцца так, што і вам будзе патрэбная дапамога ды лячэнне. Таму даваць сабе адпачынак, не браць залішняй нагрузкі — не раскоша, а неабходнасць. Няпроста бывае прызнаць сваю слабасць.

Пагадзіўшыся на тым, што ніхто не будзе даглядаць маму лепш, чым мы самі, доўга пазбягалі размоў пра пакаёўку, хоць дзяржава прадугледжвае аплату для асоб, якія працуюць у сем'ях інвалідаў першай групы. Ды і тата быў супраць, каб у хату прыходзіў чужы чалавек. Ён баяўся даверыць каму-небудзь нават змену памперсаў — ну, вось нарэшце яны з'явяцца ў маім допісе. Спакойна можна было апусціць пікантны момант, бо гэта насамрэч зусім нескладана. Ні фізічна (калі паўтарыць гэтае дзеянне некалькі разоў, усё далей ідзе аўтаматычна — справа тэхнікі). Ні псіхалагічна: калі перад вамі дарагі чалавек, то вы любіце ў ім усё. Як бацькі клапоцяцца пра сваіх немаўлят, імкнуцца трымаць іх чысценькімі ды радуюцца, што ў іх арганізме ўсё нармальна, так жа гэта працуе і ў адваротны бок: вось гэтаму безабароннаму чалавечку вы можаце быць карысны менавіта зараз, менавіта такім чынам, і дай Бог, каб гэта быў самы вялікі клопат. Таму што ёсць шмат сітуацый, калі вы не можаце зразумець, што баліць, што не так, чаму стогне — не распавядзе. І не можаце ніяк аблегчыць пакуты, толькі нервуецеся. Памперс, наадварот, дзейнічае заспакаяльна: у нас усё ў парадку. Гэта неабходны рытуал, сакральнае дзеянне любові і пяшчоты. Таму мы стараемся рабіць гэта самі пры тым, што ўжо ёсць на каго абаперціся.

За год адкінулі стэрэатыпы і гордасць, што з усім справімся самі, — і ў нас з'явілася Іра, не столькі пакаёўка, колькі памочніца, надзейная, моцная і добрая жанчына. Дзякуючы ёй сталі вучыць маму хадзіць, падтрымліваючы і перастаўляючы ёй ногі — важна ж нагадаць, як гэта калісьці было, а раптам прачнецца такое жаданне?.. Цуды магчымы, упэўнена Іра. Суседка і былая настаўніца, якую мама добра ведае, бо разам хадзілі ў царкву, акрамя добрых рук, каб размінаць цела, мае шмат кніг з малітвамі. Яна чытае іх каля ложка, а мама ўважліва слухае. А то і сама вучыцца чытаць, дапамагае ў гэтым дзіцячая Біблія, што засталася ў спадчыну ад унучкі. Кніжка з вялікімі і прыгожымі літарамі ды малюнкамі, сутнасць якіх мы тлумачым уголас, як аказалася, мае вялікую сілу, дазваляе актывізаваць інтэлект. Наогул, калі мама бачыць і чуе словы, якія жывуць глыбока ў яе душы, то вельмі стараецца вымаўляць іх. Урачы кажуць: мову інсультнікам вяртаюць песні. Не наш выпадак. Нашмат больш ахвотна, чым спявае, матуля моліцца. І кожны вечар перад сном мы разам прагаворваем «Ойча наш...» ды «Багародзіцу». Яна заўсёды малілася за нас, гэта вядомая ёй справа, якую яна ахвотна робіць нават у сваім новым стане — яна любіць, і гэтая яе сутнасць нікуды не знікла. І як жа ўрачыста гучаць гэтыя словы з яе вуснаў — адчувае, дзе сапраўдная дапамога?..

— Ваша імя, імя па бацьку, прозвішча? — запытаўся ўрач, які прыйшоў кантраляваць стан хворай на каранавірус (не абышоў ён бацькоў). Мама старалася адказваць сама, наколькі было магчыма, хоць з-за тэмпературы свядомасць была зблытаная, а тут яшчэ інсульт у анамнезе. Яна ўласным прыкладам нібыта абвяргала любыя развагі: што лепш для такіх хворых і ці варта змагацца за іх жыццё. А калі здарыўся момант, што стала цяжка дыхаць, пальцы рэзка пасінелі, а на аксіметры лічбы зніклі наогул, яна схапіла тату за руку і не адпускала, пакуль не прыехала «хуткая». Яна чапляецца за жыццё. І кожны раз у складанай сітуацыі дэманструе нам: не трэба здавацца. Не губляць веру!

Вось гэта найбольш складана для блізкіх — знайсці крыніцу веры і не адыходзіць ад яе, не спакушацца на ляноту, на «потым», на «як ёсць». Але раніцай, калі матулька міргае сваімі чыстымі блакітнымі вачыма і кажа «прывітанне», вы радуецеся, таму што разумееце: новы Божы дзень дадзены нездарма.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ЦУДЫ СВАІМІ РУКАМІ

**Для большасці людзей час перад Калядамі асацыюецца з цудамі. У некаторых краінах, напрыклад, менавіта гэтымі днямі не толькі дораць падарункі блізкім, але і робяць добрыя справы — дапамагаюць дабрачынным арганізацыям і тым, хто мае патрэбу. Мая знаёмая з Мінска таксама некалькі гадоў запар пякла пірагі перад зімовымі святамі. Прыносіла іх на работу і падчас абедзеннага перапынку прадавала па кавалачку сваім калегам — усе грошы ішлі на навагоднія падарункі анкахворым дзецям.**

**Героі, пра якіх я сёння хачу распавесці, таксама не чакаюць цуды, а ствараюць іх сваімі рукамі. Прычым робяць гэта не толькі перад святамі, а круглы год.**

## Цеплыня ад бабуль

У вёсцы Хваенск, што ў Жыткавіцкім раёне на Гомельшчыне, 50 жыхароў.

— Летам у іх ёсць занятак — агароды, унукі, — распавядае **Настасся ЦЯСЛЮК, гаспадыня этнааграсядзібы «Прыродазнаўства»**. — А зімой тут сумна. Таму мясцовыя бабулі любяць прыходзіць да мяне на сядзібу — проста папіць гарбаты, паразмаўляць, абмеркаваць навіны, згадаць былое.

Летась Настасся ладзіла ў вёсцы свята для дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Хацелася падарыць ім штосьці душэўнае, акрамя цукерак і канцтавараў.

— Вось мае бабулі і прапанавалі: «Настуся, а давай мы шкарпэтак навяжам?» І, што вы думаеце, навязалі. Я тады зрабіла пра гэта пост у «Інстаграм». І людзі пачалі адгукацца: «І я з радасцю насіла б шкарпэткі ад бабуль. Ці маглі б яны і мне звязаць?»

Было столькі заявак, што дзве хваенскія бабулі не спраўляліся. І Настасся пачала падключаць майстрыц з суседніх Азяранаў. Так з'явіўся сацыяльны праект «Бабуля».

— У нас на Палессі спакон вякоў гадавалі авечак і вязалі ваўняныя шкарпэткі — колкія, шчыльныя і вельмі тоўстыя, — распавядае Настасся. — Таму, каб захаваць мясцовыя традыцыі, набываю ніткі са стапрацэнтнай авечай воўны. Менавіта з іх і вяжуць шкарпэткі мае бабулі. Самай старэйшай вязальшчыцы — бабулі Серафіне — за 80. Яна вяжа толькі для нованароджаных дзетак.

Звязаныя шкарпэткі Настасся адпраўляе па пошце. Прычым не толькі па Беларусі, але і ў Германію, Расію, Італію, Амерыку...

— Самае важнае, што цяпер бабулі ўзімку не сумуюць, бо заўсёды пры справе. Яны па-ранейшаму заходзяць да мяне на сядзібу. Размаўляюць і адначасова вяжуць шкарпэткі. Гэта для іх у першую чаргу спосаб баўлення часу. Плюс, што прыемна, за сваю працу яшчэ і грошы атрымліваюць.

Дзіцячыя шкарпэткі, дарэчы, бабулі вяжуць бясплатна. І дзеці ў знак падзякі дасылаюць майстрыцам паштоўкі, малюнкі. Для бабулек гэта вельмі каштоўна. Усе лісты — на самае бачнае месца — у сервант.



Фота Дзмітрыя КУЧЫНСКАГА.

Бабуля Таня.

— Я заўсёды завочна знаёмлю заказчыкаў з бабулямі: «Сябра, твае шкарпэткі будзе вязаць баба Тома (ці баба Таня, Галя, Марына)». І апраўляю яе фотаздымак. Летась дасылала ў Германію шкарпэткі для дваіх брацішкаў. Ім так спадабалася наша баба Тома: былі ўражаны, што ў яе ажно 17 унукаў. Дык вось хлопчыкі, нягледзячы на тое, што не размаўляюць па-руску, вырашылі самі падпісаць ёй паштоўку. Не ўсе літары былі павернуты ў патрэбны бок. Але гэта вельмі кранальна, бо дзеці вучыліся пісаць па-руску, каб зрабіць бабулі прыемна.

## #ПагуляйзСашам

Саша Зянько жыве ў Мінску разам з мамай. Яму 36 гадоў. Яшчэ ў дзяцінстве хлопцу паставілі дыягназ ДЦП. Саша перасоўваецца на інваліднай калясцы і не размаўляе. Але дзякуючы сваёй энергіі і ўважлівасці мамы ён засвоіў камп'ютар. Водзіць падбародкам па мышцы і такім чынам кіруе ёй. Яшчэ ён можа трымаць у зубах палачку і дакранацца ёй да літарак на клавіятуры. Дзякуючы гэтаму ён «пагрукаў у свет» пры дапамозе «Фэйсбука». Сам, ніхто яму не дапамагаў, стварыў праект, які так і называецца #ПагуляйзСашам #ДцпНеПерашкода. Расказаў, што сядзіць у чатырох сценах. Мама не можа вывадзіць яго на вуліцу, бо ў яе баліць спіна. І папрасіў добрых людзей гуляць з ім час ад часу.

І аказалася, што чулых людзей дастаткова шмат. Дзякуючы ім Саша ўжо пабыў на Мінскім моры, у «Дрымлэндзе», папугайні, музеі авіяцыйнай тэхнікі, у Нацыянальнай бібліятэцы, заапарку, тэатры, галерэі сучаснага мастацтва, Батанічным садзе, у некалькіх рэстаранах, кавярнях і гандлёвых цэнтрах, удзельнічаў у інклюзіўных паўмарафонах...

**Стас Сініца** — адзін з тых, хто ўбачыў пост Сашы ў інтэрнэце. З таго часу, як толькі з'яўляецца магчымасць, забірае хлопца з кватэры і паказвае яму нейкае цікавае месца.

— Я стараюся загадзя планаваць нашы паходы ў тэатр ці кавярню, — кажа Стас. — Калі ж часу не вельмі шмат, гуляем у скверыку, што побач з домам. Саша вельмі любіць усё нюхаць: можна проста ездзіць па лесе і падносіць яму да носу шышкі, прэлае лісце, снег. У нас ёсць любімы рытуал: абавязкова заязджаем у краму і п'ём малочны кактэйль.

Пасля кожнай прагулкі на старонцы Сашы ў «Фэйсбуку» з'яўляецца допіс з фотаздымкамі. Рабіць пасты пра тое, як правеў дзень, яму прапанаваў Стас.

— Сашу першы час было складана нават запомніць, што з ім адбывалася, — распавядае Стас Сініца. — Проста не было такога навыку, ён не быў запатрабаваны. Таму пастаянна прасіў мяне запісаць яму на тэлефоне, як называецца месца, дзе мы гуляем. Зараз — гляджу па яго пастах — ён піша ўсё лепш і лепш, ужо нават жартаваць спрабуе. Саша наогул вельмі пазітыўны чалавек. Калі казаць пра цуды, то ён сам па сабе цудоўны.

Аднойчы нехта аддаў Сашу зімовы камбінезон. Праўда, апранаць яго было адно мучэнне. Стас ведаў пра гэту праблему, таму звярнуўся да сваёй знаёмай — мадэльера Алы Грынкевіч.

— У Алы ёсць сваё атэлье. І я папрасіў яе перарабіць той камбінезон для Сашкі, — працягвае Стас. — Яна спецыяльна прыязджала да яго дадому. Хлопец пісьмова патлумачыў, што яму патрэбна. У прыватнасці, у Сашы вельмі моцна націраюцца ногі ў каленях, у выніку ледзь не крывавыя мазалі ўзнікаюць. Таму Ала раздзяліла камбінезон на дзве часткі і на штанах зрабіла мяккія накладкі. Рукавы ж курткі разрэзала і ўшыла туды маланкі. А яшчэ зрабіла ў ёй спецыяльныя вентыляцыйныя ўстаўкі.

У Стаса ёсць любімае хобі. Ён не толькі сам танцуе танга, але і вучыць гэтаму іншых. З нядаўняга часу на яго занятках з'явіліся людзі ў інвалідных калясках.

— Усё дзякуючы Сашку, — смяецца Стас. — Аднойчы я быў у яго ў гасцях і ўключыў музыку на тэлефоне. І мы з ім разам танцавалі танга. Гэта быў экспромт. Потым я выклаў гэтае відэа ў сацыяльныя сеткі. Мамы, у якіх таксама дзеці ў інвалідных калясках, пабачылі той запіс. Напісалі, што яны з задавальненнем прыходзілі б на мае заняткі па танцах разам са сваімі дзецьмі. Я пагаварыў з дырэктарам студыі. Яна была не супраць.



Саша ЗЯНЬКО ў перапробленым Алай ГРЫНКЕВІЧ камбінезоне.

## Домік для князька

З **валанцёркай Вольгай Харытановіч** мы стэлефанаваліся суботняй раніцай. У выхадны марозны дзень захавальніца Палесся «Аховы птушак Бацькаўшчыны» прачынаецца з пеўнямі і едзе на возера Чырвонае, што ў Жыткавіцкім раёне. Разам з арнітолагамі ды аднадумцамі-валанцёрамі (у рамках праекта «Палессе — дзікая прырода без межаў») нацягвае арніталагічныя сеткі і кальцуе птушак. Гэтым разам у цэнтры ўвагі чырванакніжная белая сініца (іншая назва — князёк). Птушка 2022 года па выніках галасавання «Аховы птушак Бацькаўшчыны». У Беларусі яе можна пабачыць толькі на Палессі. Селіцца прыгажуня нябесна-блакітнага колеру ў пойме ракі Прыпяці. Узімку белыя сініцы сноўдаюць у пошуках ежы ў густых зарасніках трыснягу на берагах вадаёмаў. Пакуль пра палескага князька вядома няшмат. Менавіта кальцаванне дапаможа дазнацца больш.

Вольга па адукацыі ветурач. 30 гадоў пражыла ў Мінску. Аднойчы пабывала на Палессі — і палюбіла гэтае месца ўсёй душой. Таму, не раздумваючы, пераехала жыць у вёску Запясочча, што непадалёку ад Турава.



Дамкі-дуплянкі для белай сініцы.

— Калі тут жывеш і штодзень бачыш гэту прыгажосць, разнастайнасць жывёл і птушак, хочацца штосьці рабіць, каб усё гэта захаваць, — кажа валанцёрка. — Асноўная пагроза для белай сініцы — веснавыя палы ў поймах, меліярацыя, высечка старых дрэў. У выніку ў птушкі з'яўляюцца праблемы з месцамі для гнездавання. Князёк адкладае яйкі ў дуплах старых дубоў і вербаў на заліўных берагах Прыпяці. Пойменныя пажары знішчаюць дрэвы, у якіх птушка магла б гнездавацца. Часта бывае, што бездапаможныя птушаняты проста згараюць. Яшчэ адна пагроза — драпежнікі. Белая сініца часта селіцца паблізу людзей. Шмат птушанят гіне ў гнёздах, якія недастаткова абаронены ад вясковых катоў.

У Нацыянальным парку «Прыпяцкі», дзе Вольга тры месяцы працуе спецыялістам па экалагічным турызме, таксама занепакоены лёсам белай сініцы. Каб дапамагчы гэтай рэдкай птушцы (у 2015 годзе ў Беларусі налічвалася ўсяго толькі 500—800 пар), зрабілі 250 дамкоў-дуплянак.

— Князёк з задавальненнем займае штучныя дуплянкі. Развесім іх да красавіка ў пойме Прыпяці. Вельмі спадзяёмся, што сінічнікі дапамогуць князьку вырашыць кватэрнае пытанне і яго колькасць будзе павялічвацца. Вясной адправімся правяраць, колькі белых сініц засялілася ў новыя домікі, колькі яек адклалі самкі. Калі вылупяцца птушаняты, будзем іх кальцаваць. Яркія каляровыя кольцы на лапках белых сінічак дазволяць прасачыць, як яны перамяшчаюцца і дзе жывуць у розныя поры года.

Дапамагчы зрабіць рэдкую птушку больш вядомай можа і кожны з нас. Для гэтага дастаткова паўдзельнічаць у творчым конкурсе «Аперацыя Князёк», які аб'явіў Нацыянальны парк «Прыпяцкі». Зрабіце выраб, звязаны з белай сініцай. Гэта можа быць малюнак, вышыўка, выраб з дрэва, паперы, нітак, бісеру. На што хопіць фантазіі... Апублікуйце фота гатовай работы да 27 лютага ў пасце ў «Інстаграм» з хэштэгам #конкурсаперацыякнязёк.

— Творчасцю таксама можна дапамагаць, — перакананая Вольга Харытановіч. — Кожная работа будзе прыцягваць увагу да праблем палескага князька, неабходнасці захавання месцаў, дзе яны жывуць. Мы выберам тры самыя цікавыя і крэатыўныя работы. Пераможцы змогуць паўдзельнічаць у навуковых экспедыцыях па назіранні за гэтай унікальнай птушкай і кальцаванні птушанят. Дарэчы, замежныя турысты гатовы плаціць вялікія грошы, каб прыехаць на Палессе і палюбавацца менавіта на белую сініцу.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

Марат МАРКАЎ:

# «КАЛІ МЫ ЦЭНІМ ТОЕ, ШТО Ў НАС ЁСЦЬ, МОЖАМ АТРЫМАЦЬ ЗНАЧНА БОЛЬШ!»

**Кіраўнік, які валодае стратэгічным мысленнем і ў любой сітуацыі мае план, які вядзе да поспеху. І поспех гэты не выпадковы, а заканамерны. Дзякуючы якасцям сапраўднага лідара, магчымасці прагназаваць развіццё падзей і прадбачыць наступствы, тэлеканал АНТ пад яго кіраўніцтвам і сёння працягвае быць вядучым СМІ нашай краіны. Пра шматгранную прафесійную дзейнасць на карысць дзяржаве, фэйкі і праўду, будучыню тэлебачання і пра тое, чаму б яшчэ хацелася навучыцца... З кіраўніком тэлеканала АНТ Маратам МАРКАВЫМ падводзім вынікі 2021 года і заглядаем у год наступны.**



***— Марат Сяргеевіч, 2021 год у эмацыянальным сэнсе — гэта працяг 2020-га. Пасля жніўеньскіх падзей вы былі адным з тых, хто працягваў працаваць, не пайшоў з кадра, а, наадварот, абараняючы інтарэсы дзяржавы, заняў актыўную пазіцыю і не сумняваўся, на якім баку праўда. Што дапамагло вам тады і дапамагае цяпер эфектыўна працаваць?***

— У гэтым пытанні ёсць некалькі прынцыповых момантаў. Па-першае, у жніўні 2020-га ў мяне не было ніякіх сумненняў. Я ні на секунду не задумваўся, на чым баку праўда. Я гэта ведаў дзякуючы пэўнаму вопыту працы і жыцця. Так атрымалася, што ўсё тое, што з намі паспрабавалі здзейсніць, я ў свой час праходзіў у тэорыі: калі пісаў дысертацыю па выбарчых тэхналогіях, калі знаёміўся з метадычкай Шарпа, калі вывучаў «каляровыя» рэвалюцыі ў іншых краінах свету. Цяжка было ўпершыню ўбачыць, як гэта працуе на практыцы. Другі момант — гэта здрадніцтва. На жаль, у асяроддзі дзяржаўных людзей (чыноўнікаў, журналістаў, селебрыці) знайшліся здраднікі. А здрадніцтва для мяне асабіста не прымальнае. Ныглядзячы на сітуацыю, ты не маеш права здрадзіць, таму што потым сам сабе гэтага не даруеш.

***— Наколькі складана было данесці сваю пазіцыю да людзей, якія працуюць побач з вамі, каб яны таксама зразумелі, што ёсць што?***

— Ёсць цудоўны выраз: «Час абраў нас!» Тады я дакладна разумеў, што час абраў нас і ад нашых учынкаў, ад учынкаў соцень і тысяч асобных людзей залежыць будучыня дзяржавы. Канешне, быў пэўны страх аказацца неэфектыўным, падабраць не тыя словы, каб растлумачыць людзям, што адбываецца на самай справе, і натхніць іх на работу. Для нас усіх гэта было ўпершыню. Але ж праўда заўсёды была на нашым баку, і гэтыя 500 дзён, якія прайшлі з выбараў, паказалі, хто спрабаваў перавярнуць краіну, навошта ён гэта рабіў і хто яму за гэта плаціў. Усё потым напішуць у падручніках па гісторыі. І наша гісторыя ўнікальная: Беларусь аказалася той адзінай краінай, дзе «каляровая» рэвалюцыя не адбылася. Вельмі каштоўна, калі на чале дзяржавы ёсць чалавек, моц якога ты адчуваеш і на якога можаш абаперціся. Вядомы выраз: «Прэзідэнтамі не становяцца, прэзідэнтамі нараджаюцца» у дачыненні да кіраўніка нашай краіны мае вельмі глыбокі сэнс.

***— У выніку інфармацыйнага супрацьстаяння ў 2020 годзе тэлеканал АНТ пацярпеў больш за іншыя беларускія тэлеканалы і ў выніку апынуўся ў пэўнай эканамічнай блакадзе. Наколькі ў 2021 годзе атрымалася пераадолець негатыўныя наступствы?***

— Сапраўды, эканамічны ўдар быў моцны. Самае цынічнае ў гэтай сітуацыі тое, што нават некаторыя дзяржаўныя кампаніі і прадпрыемствы не падтрымалі нас у той складаны час. Прыпынілі размяшчэнне рэкламы на АНТ і тыя замежныя кампаніі, якім наша дзяржава дала магчымасць развіваць свой бізнес у Беларусі. Яны ўсе вядомыя: гэта і банкі, і сотавыя аператары, і буйныя гандлёвыя сеткі.

Але ж, нягледзячы на ўсё гэта, мы не апусцілі рукі, а працягвалі працаваць, і вельмі эфектыўна. Мы нарасцілі колькасць гледачоў, долю тэлепраглядаў, у нас выраслі рэйтынгі і з'явіліся новыя імёны. Самае галоўнае — мы не прыбралі з эфіру ніводнай палітычнай праграмы. Наадварот — павялічылі іх колькасць і якасць. Рэклама — перш за ўсё эканоміка. Можна размясціць рэкламу дзе заўгодна, але, калі яна не прыносіць прыбытку, гэта ўжо неэфектыўны бізнес. АНТ — вядучы тэлеканал краіны, і не рэкламавацца на ім з пункту гледжання ахопу і рэйтынгаў — па меншай меры, глупства.

***— Што прадпрымалася дзеля выхаду з крызіснай сітуацыі?***

— Самае галоўнае правіла ў любой крызіснай сітуацыі — абмежаванне выдаткаў і пошук новых крыніц прыбытку. Па сутнасці, мы нічым не адрозніваемся ад тых прадпрыемстваў, якія трапілі пад санкцыі. Наш тэлеканал быў дальнабачным і падрыхтаваўся да выбараў. Была створана фінансавая падушка бяспекі, а зараз мы знайшлі новыя крыніцы даходу. У нас з'явілася новыя рэкламадаўцы з ліку беларускіх прадпрыемстваў, пачалі вяртацца старыя партнёры, і, галоўнае, мы адчулі цвёрдую дзяржаўную падтрымку і зараз не сумняваемся ў будучыні.

***— У інтэрнэт-прасторы падаецца інфармацыя аб тым, што з тэлеканала АНТ у 2020 годзе па палітычных матывах звольнілася больш за ўсё супрацоўнікаў. Ці так гэта на самай справе?***

— У сувязі з падзеямі 2020 года нас стала менш на 50 чалавек. Гэта роўна 1/8 частка супрацоўнікаў. Нядаўна я прааналізаваў статыстыку звальненняў на АНТ за амаль 20 гадоў існавання тэлеканала. Самае цікавае тое, што ў сярэднім за год з АНТ звальнялася 20—30 чалавек. Звычайная прафесійная ратацыя. Падчас фінансавых катаклізмаў гэта лічба яшчэ павялічвалася. Зараз адбылася ратацыя не на колькасным, а на якасным узроўні. Ад нас пайшлі людзі, якія не былі гатовыя працаваць у адпаведнасці з дзяржаўнымі інтарэсамі. Дзякуй ім за шчырасць. Мяне перыядычна крытыкуюць за тое, што я даволі жорстка адстойваю пазіцыю дзяржавы, але на гэты конт у мяне ёсць вельмі яскравы прыклад. Прапануйце супрацоўніку на польскім тэлеканале, які фінансуецца дзяржавай, публічна ўсхваляць Беларусь ці выступіць з крытыкай Маравецкага з Дудам. Што будзе з гэтым супрацоўнікам? Прыклады ўжо былі.

***— Якой стала каманда АНТ у мінулым годзе? І для якога гледача вы працягваеце працаваць?***

— Нашу каманду можна параўнаць з кветкай, якая жыла ў цяплічных умовах, а пасля небяспечных кліматычных змяненняў спачатку скурчылася, а потым набралася сілы і выстаяла. У 2021 годзе наша каманда стала больш прафесійнай, куленепрабівальнай. Пасля таго жаху і булінгу, які ўсе мы адчулі на сабе, другі раз гэта не пройдзе. Мы сталі больш спакойнымі і псіхалагічна ўстойлівымі. З пункту гледжання тэлевізійнага прадукту мы пачалі працаваць лепей, больш прафесійна. І сёння працуем на сваю пастаянную аўдыторыю, у тым ліку на тых, хто яшчэ сумняваецца. На мой погляд, місія АНТ заключаецца ў тым, каб даць аргументы і людзям, якія сумняваюцца, дзеля таго, каб яны даверыліся дзяржаўнаму курсу.

***— Нядаўна ў «Вікіпедыі» пра вас размясцілі цікавы артыкул. Што ў ім праўда, а што фэйк?***

— На самай справе, 90 % фактаў, якія змешчаны ў гэтым артыкуле, хоць і ангажыраваныя, але праўдзівыя. Яны падаюцца са спасылкамі на пэўныя артыкулы, сярод якіх большасць мае асабістыя інтэрв'ю. Але ж аўтар артыкула, відавочна, не служыў у арміі. «Маркаў, які праслужыў 13 гадоў ва Узброеных Сілах, даслужыўся да намесніка камандзіра ўзвода». Насамрэч гэта сяржанцкая пасада. Зразумела, што аўтар не разумее, як пабудавана ваенная служба. Сапраўды, я быў намеснікам камандзіра ўзвода, на першым курсе ваеннага вучылішча ў званні малодшага сяржанта. Гэта праўда. Але пасля 13 гадоў ваеннай службы я быў у званні маёра юстыцыі і на той момант быў старшым следчым Ваеннай акадэміі. У артыкуле няма ні слова пра тое, што я два гады праслужыў на палігоне ў Капусціным Яры, начальнікам станцыі аптычных сродкаў. Тады я ўпершыню пазнаёміўся з кінакамерай. Толькі яна была тры метры вышынёй і выкарыстоўвалася для адсочвання траекторыі палёту эксперыментальных ракет ЗРК. Пазней мне здавалася, што гэта знаёмства было вызначана лёсам.

Яшчэ адзін недакладны момант датычыцца колькасці тых, хто звольніўся з тэлеканала АНТ і яшчэ некалькі момантаў. У гэтай сувязі хочацца адзначыць, што, калі б маю біяграфію давалі на тэлебачанні, фэйкаў там дакладна не было б. А вось інтэрнэт хавае любую хлусню. Самае галоўнае, што дабіцца ісціны будзе практычна немагчыма. Таму ў тэлебачання вялікая будучыня, перш за ўсё як у каманды прафесіянальных стваральнікаў праўдзівага тэлевізійнага кантэнту. Усё астатняе — тэхналогіі.

***— Амаль пяць гадоў вы ўзначальваеце тэлеканал АНТ. Нягледзячы на аб'ектыўныя цяжкасці, сёння тэлеканалу ёсць чым ганарыцца. Якія дасягненні вы асабіста можаце адзначыць?***

— Мяне вельмі часта крытыкуюць за тое, што я ганаруся сваім каналам. Але ж аб'ектыўна нагода для пэўнага гонару ў мяне ёсць. Мы застаёмся лідарамі на тэлевізійным рынку нашай краіны, пастаянна павялічваем долю ўласнага тэлекантэнту. Дасягнулі добрых вынікаў у YouTube: першымі з дзяржаўных СМІ атрымалі «сярэбраную кнопку». На гэтай пляцоўцы ў нас сотні мільёнаў праглядаў і паўмільёна падпісчыкаў. Акрамя гэтага, мы маем добрыя прагляды на сайце па паўтара мільёна за тыдзень. Кантэнт тэлеканала АНТ глядзяць ва ўсіх кутках свету. Геаграфія вельмі шырокая: Амерыка, Германія, Украіна, Расія, Кітай. Зразумела, што людзям патрэбна правераная і праўдзівая інфармацыя. І мы ім яе даём.

Хачу асабліва падкрэсліць, што ўсе гэтыя поспехі — не мае. Гэта поспехі той каманды людзей, якая выкрышталізавалася пасля падзей 2020 года і якой можна даверыцца. Прафесійна яна вельмі класная. Падводзячы вынікі 2021 года, я вельмі рады канстатаваць, што трэць супрацоўнікаў каманды АНТ працуе на канале больш за 15 гадоў, некалькі дзясяткаў чалавек з першых дзён стварэння тэлеканала. Гэта наш залаты фонд!

***— У вашым партфоліа інтэрв'юера толькі на канале АНТ каля 200 інтэрв'ю. Якія з іх вас уразілі больш за ўсё?***

— Выдзеліць можна некалькі яскравых, але кожнае інтэрв'ю па-свойму каштоўнае. Былі ўдалыя і не вельмі, але ж ніводнае не было прахадным. На паверхні, канешне, інтэрв'ю з Пратасевічам. Яно было вельмі своечасовым і прызначалася, перш за ўсё, для інтэрнэт-аўдыторыі. У памяці першае інтэрв'ю з Юрыем Васкрасенскім. Мы абралі новую лакацыю па-за межамі студыі. І ў гэтым выпадку для мяне было вельмі важным, што мы паказалі, якія супярэчнасці могуць існаваць унутры кожнага чалавека. Хочацца адзначыць інтэрв'ю з парай Макеяў. Мы паспрабавалі інтэрв'ю ў крыху новым фармаце: запрасілі дваіх вельмі вядомых людзей, якія на першы погляд вельмі розныя, але пры гэтым эфектыўна працуюць і цудоўна жывуць пад адным дахам. Асабіста мне спадабалася размова з Ігарам Шуневічам. Гэта яскравы прыклад чалавека, які вельмі сур'ёзна рыхтуецца да інтэрв'ю. Тыя пасылы, якія прагучалі з яго боку, шырока разышліся сярод нашых гледачоў. Канешне, у многім статус госця вызначае поспех праграмы, высокую цытаванасць і назаўсёды застаецца ў памяці. Калі падчас размовы з прэс-сакратаром Прэзідэнта Наталляй Эйсмант ад яе гучыць пасыл: «Дыктатура — наш брэнд!», гэта немагчыма не запомніць. Дарэчы, сёння цікава глядзець на тое, як пад сцягам дэмакратыі, да якой многія імкнуцца, знішчаюць мільёны людзей. А пад сцягам беларускай дыктатуры будуецца сацыяльная дзяржава і выратоўваюцца бежанцы на граніцы. Я гатовы адзначаць гэты парадокс у тым ліку і пры дапамозе інтэрв'ю.

***— Чаму вы вучыцеся ў сваіх суразмоўцаў?***

— У кожнага свайму. Госці ўсе розныя. Адзін моцны, як крэмень, другі творчы, трэці вельмі любіць сваю сям'ю. Самае галоўнае, што я ХАЧУ ў іх вучыцца. Яны для мяне цікавыя. Як толькі перастае цікавіць чалавек, які да цябе прыходзіць, трэба заканчваць з гэтай прафесіяй.

***— Марат Сяргеевіч, што для вас зараз больш важна: шлях ці вынік?***

— Перш за ўсё для мяне як журналіста, як кіраўніка прадпрыемства ВЫНІК мае значэнне. Я не хачу займацца працэсам дзеля працэсу. Калі ў 2017 годзе я прыйшоў на АНТ, для мяне быў вельмі важны менавіта вынік. Спачатку мы зрабілі адну новую студыю, потым другую, трэцюю. Сфарміравалі каманду. Пачалі працаваць па-новаму, выпускаць новыя праграмы. Гэта быў вынік. Чым добра працаваць на тэлебачанні, дык гэта тым, што ты бачыш вынік кожны дзень. І для цябе якасць выніку мае вялікае значэнне.

Калі разважаць пра гэта па-за межамі прафесіі ў кантэксце жыцця, то тут трэба дакладна разумець, што для нас усіх вынік адзін. Да гэтага ўсе мы прыйдзем. І тут, канешне, вельмі важны ПРАЦЭС. У многіх з нас ёсць праблема, у якой мы не хочам сабе прызнацца. Па прычыне высокай занятасці мы пастаянна рыхтуемся жыць. Рыхтуемся замест таго, каб жыць у моманце і атрымліваць ад яго асалоду. У дадзеным выпадку вынік — тое, што мы хацелі б адтэрмінаваць. Калі навучымся жыць у моманце, станем шчаслівымі. Вельмі спадзяюся, што такія людзі існуюць.

***— Які ваш асабісты план на 2022 год?***

— Працаваць. Бо ад работы аперацыйным менеджарам на АНТ нікуды не дзенуся і ў наступным годзе. Я хачу, каб наша прадпрыемства зноў стала моцна на ногі і ў 2022 годзе зрабіла якасны рывок. Але ёсць у мяне і вялікае жаданне навучыцца жыць сённяшнім днём, менавіта жыць, а не рыхтавацца.

***— Што пажадаеце беларусам у 2022 годзе?***

— Як правіла, калі мы штосьці жадаем іншым, перш за ўсё, гэтага жадаем сабе. З-за ковіду мы навучыліся цаніць здароўе. Гэта самае галоўнае. Ад клопату пра здароўе нікуды не дзенемся. Здаровая нацыя — не толькі здароўе фізічнае, але і псіхалагічнае і эмацыянальнае. На жаль, многія нашы праблемы ўзніклі ад таго, што камусьці не хапіла менавіта псіхалагічнага здароўя. Жадаю ўсім нам цвярозасці і выразнасці крытычнага мыслення. Каб усе мы цанілі тое, што ў нас ёсць. Толькі дзякуючы гэтаму можам атрымаць больш!

**Кацярына ТУМАС-ЦІШКЕВІЧ.**
**Фота прэс-службы тэлеканала АНТ.**

Обществу с ограниченной ответственностью
**«РОДАНАГРОСЛОНИМСКИЙ»**
Слонимского района Гродненской области, работающему в направлении современного сельского хозяйства,

**НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ ТРЕБУЕТСЯ:**

## АГРОНОМ

**Требования:** высшее профильное образование, опыт работы в сельском хозяйстве, готовность и желание обучаться. Дисциплинированность, инициативность, исполнительность, ответственность, умение работать с большим объемом информации, умение организовать и координировать работу, желание работать на результат, высокий уровень личной ответственности.

**Предлагаем:**

- ✔ Работу в современной компании с иностранным капиталом;
- ✔ Трудоустройство согласно ТК РБ;
- ✔ Достойную оплату труда: 2 000 – 4 000 руб. (уровень предлагаемой зарплаты: оклад + премиальные выплаты по результатам работы. Итоговая зарплата будет определена по результатам собеседования);
- ✔ Возможность обучения в лучших сельскохозяйственных организациях страны и за рубежом (ЕС);
- ✔ Обеспечение жильем по договору найма;
- ✔ Система мотивации получения результатов труда;
- ✔ Корпоративная безлимитная мобильная связь;
- ✔ Социальный пакет согласно коллективного договора.

**Контакты:**

Резюме отправлять на e-mail: **mp@rodanagro.com**
тел.: **+375 (33) 399-38-60**
**+375 (44) 778-80-48**
(отдел кадров)

УНП 592000776

Обществу с ограниченной ответственностью
**«РОДАНАГРОСЛОНИМСКИЙ»**
Слонимского района Гродненской области, работающему в направлении современного сельского хозяйства,

**НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ ТРЕБУЕТСЯ:**

## ЗООТЕХНИК

**Требования:** высшее профильное образование, опыт работы в сельском хозяйстве, готовность и желание обучаться. Дисциплинированность, инициативность, исполнительность, ответственность, умение работать с большим объемом информации, умение организовать и координировать работу, желание работать на результат, высокий уровень личной ответственности.

**Предлагаем:**

- ✔ Работу в современной компании с иностранным капиталом;
- ✔ Трудоустройство согласно ТК РБ;
- ✔ Достойную оплату труда: 2 000 – 4 000 руб. (уровень предлагаемой зарплаты: оклад + премиальные выплаты по результатам работы. Итоговая зарплата будет определена по результатам собеседования);
- ✔ Возможность обучения в лучших сельскохозяйственных организациях страны и за рубежом (ЕС);
- ✔ Обеспечение жильем по договору найма;
- ✔ Система мотивации получения результатов труда;
- ✔ Корпоративная безлимитная мобильная связь;
- ✔ Социальный пакет согласно коллективного договора.

**Контакты:**

Резюме отправлять на e-mail: **mp@rodanagro.com**
тел.: **+375 (33) 399-38-60**
**+375 (44) 778-80-48**
(отдел кадров)

УНП 592000776

Обществу с ограниченной ответственностью
**«РОДАНАГРОСЛОНИМСКИЙ»**
Слонимского района Гродненской области, работающему в направлении современного сельского хозяйства,

**НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ ТРЕБУЕТСЯ:**

## БУХГАЛТЕР

**Требования:** высшее профильное образование, уверенный пользователь ПК, знание в совершенстве 1С-бухгалтерии (8 версия), программ XL и Word, опыт работы в сельском хозяйстве, готовность и желание обучаться. Дисциплинированность, инициативность, исполнительность, ответственность, умение работать с большим объемом информации, умение организовать и координировать работу, желание работать на результат, высокий уровень личной ответственности.

**Предлагаем:**

- ✔ Работу в современной компании с иностранным капиталом;
- ✔ Трудоустройство согласно ТК РБ;
- ✔ Достойную оплату труда: 1 200 – 2 000 руб. (уровень предлагаемой зарплаты: оклад + премиальные выплаты по результатам работы. Итоговая зарплата будет определена по результатам собеседования);
- ✔ Возможность обучения в лучших сельскохозяйственных организациях страны и за рубежом (ЕС);
- ✔ Обеспечение жильем по договору найма;
- ✔ Система мотивации получения результатов труда;
- ✔ Корпоративная безлимитная мобильная связь;
- ✔ Социальный пакет согласно коллективного договора.

**Контакты:**

Резюме отправлять на e-mail: **info@issi.by**
тел. **+375 (29) 175-26-36**

УНП 592000776

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор аукциона)**
**извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества**
**ОАО «Управление механизации № 91»**
**(Продавец)**

**Лот № 1: гидравлический автомобильный грузовой специальный кран KATO NK-450S на шасси Mitsubishi K503,** регистрационный знак КА4522, заводской / кузов (рама) № CT-45176S / 20678. Начальная цена с НДС – 46 026,00 руб. Задаток – 4 602,60 руб. Шаг аукциона – 1 %.

**Лот № 2: автомобиль PEUGEOT 406,** г. в. – 1997. Начальная цена с НДС – 2 760,00 руб. Задаток – 276,00 руб. Шаг аукциона – 10 %.

**Лот № 3: автомобиль VOLKSWAGEN TRANSPORTER,** г. в. – 1998. Начальная цена с НДС – 5 160,00 руб. Задаток – 516,00 руб. Шаг аукциона – 10 %.

**Местонахождение лотов №№ 1–3:**
г. Минск, ул. Бабушкина, д. 17.

**Аукцион состоится 11.02.2022 в 11.00 по адресу:**
**г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами – **09.02.2022 в 11.00**.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

Обществу с ограниченной ответственностью
**«РОДАНАГРОСЛОНИМСКИЙ»**
Слонимского района Гродненской области, работающему в направлении современного сельского хозяйства,

**НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ ТРЕБУЕТСЯ:**

## ТРАКТОРИСТ-МАШИНИСТ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННОГО ПРОИЗВОДСТВА

**Требования:** опыт работы на энергонасыщенных тракторах, дисциплинированность, инициативность, исполнительность, ответственность, желание работать на результат, высокий уровень личной ответственности.

**Предлагаем:**

- ✔ Работу в современной компании с иностранным капиталом;
- ✔ Трудоустройство согласно ТК РБ;
- ✔ Достойную оплату труда: 2 000 – 4 000 руб. (уровень предлагаемой зарплаты: оклад + премиальные выплаты по результатам работы. Итоговая зарплата будет определена по результатам собеседования);
- ✔ Возможность обучения в лучших сельскохозяйственных организациях страны и за рубежом (ЕС);
- ✔ Обеспечение жильем по договору найма;
- ✔ Система мотивации получения результатов труда;
- ✔ Корпоративная безлимитная мобильная связь;
- ✔ Социальный пакет согласно коллективного договора.

**Контакты:**

Резюме отправлять на e-mail: **wp@rodanagro.com**
тел. **+375 (29) 935-70-20**
**+375 (44) 778-80-48**
(отдел кадров)

УНП 592000776

**Могилевский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**информирует о проведении 27.01.2022 г.**
**аукциона по продаже имущества**
**ОАО «Моготекс»**

**Лоты №№ 1–16: ткацкие станки СТБ 2-180ШЛ**, инв. №№ 50239, 50252, 50639, 50244, 50643, 50246, 50633, 50635, 50241, 50647, 50599, 50242, 50245, 50248, 50243, 50249, г. в.: 1986–1988.

**Начальная цена продажи каждого из лотов №№ 1–16:**
**2 460,00 бел. руб. с учетом НДС.**

**Лоты №№ 17–84: ткацкие станки СТБ 2-180**, инв. №№ 50569, 50570, 50613, 50628, 50012, 50014, 50016, 50018, 50020, 50567, 50568, 50022, 50023, 50576, 50575, 50076, 50572, 50019, 50021, 50593, 50596, 50584, 50581, 50583, 50586, 50595, 50597, 50465, 50601, 50604, 50607, 50611, 50614, 50616, 50618, 50620, 50622, 50624, 50626, 50629, 50631, 50637, 50013, 50015, 50017, 50615, 50617, 50619, 50623, 50627, 50630, 50632, 50641, 50621, 50625, 50574, 50573, 50598, 50600, 50602, 50603, 50608, 50612, 50577, 50579, 50578, 50580, 50582, г. в.: 1985-1988.

**Начальная цена продажи каждого из лотов №№ 17–84:**
**2 820,00 бел. руб. с учетом НДС.**

**Аукцион состоится 27 января 2022 года в 12.00**
**по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Организатор аукциона: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-550-09-56** и на сайте **ino.by**

# ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ЗАО «Снежинка»

| Лот | Наименование Лота | Начальная стоимость без НДС, BYN | Задаток, BYN | Шаг аукциона, BYN |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Кап. строение (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – здание прачечной № 2) с инв. № 630/С-78812, площадью 955 кв. м, в том числе ЦТП (363 квм) | 391 120,00 | 39 112,00 | 19 556,00 |
| 2 | Кап. строение (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж) с инв. № 630/С-82170, площадью 226 кв. м, в том числе проходная (20 кв. м) | 27 530,00 | 2 753,00 | 1 376,50 |
| Лоты 1, 2 расположены на земельном участке с кадастровым номером **642000000003000053** общей площадью **0,6734 га** для содержания и обслуживания зданий и сооружений. Право постоянного пользования | | | | |
| В отношении лотов проводятся первые торги после оценки | | | | |
| В отношении лота № 1 имеется обременение в виде ипотеки, правообладатель – ОАО «Банк БелВЭБ». По вопросам обременения обращаться по тел. +375293432510, Максим Александрович | | | | |

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **14 февраля 2022 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, дом 1, офис 1127** |
| **Срок приема заявлений и оплаты задатка** | **с 10.00 11.01.2022 по 13.00 10.02.2022 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127** |
| **Местонахождение имущества** | **Минская область, г. Молодечно, ул. Язепа Дроздовича, 23А** |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту __, ЗАО «Снежинка», проводимых 14.02.2022.

2. Заявления на участие и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах, копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта; копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127.

Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Контактное лицо по вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе – Анаида (+375 29 308 28 97).

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете «Звязда») на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: по лотам 1, 2 составляет 5 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней со дня подписания (заключения) договора купли-продажи. В случае совершения просрочки обязательства по заключению договора купли-продажи и его оплате не по вине Покупателя указанные сроки могут быть продлены.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. **По вопросу осмотра объектов обращаться к Сергею Ивановичу (+375336477307).**

8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

9. Государственная регистрация договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram: https://t.me/orgtorg** |
| **Продавец** | **ЗАО «Снежинка», УНП 600029449 (222310, Минская область, г. Молодечно, ул. Язепа Дроздовича, 23А, пом. 1) в лице директора Анопа Сергея Ивановича, тел. +375293432510 (Максим Александрович)** |

# ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «Гомельский винодельческий завод»** (УНП 400051877) 246003, г. Гомель, ул. Рогачевская, 10, тел. +375 (232) 71-38-55 в лице антикризисного управляющего Костяна Дмитрия Александровича.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **26 января 2022 г. 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Имущество филиала «Пиревичский спиртзавод» ОАО «Гомельский винодельческий завод» *с обременением**, Гомельская обл., Жлобинский р-н, аг. Пиревичи, ул. Суворова, 4 А | 2 654 835,22 |
| 2 | Имущество филиала «Рогачевский» ОАО «Гомельский винодельческий завод», Гомельская обл., г. Рогачев, ул. Богатырева, 36 | 75 840,00 |
| 3 | Имущество филиала «Речицкий» ОАО «Гомельский винодельческий завод», Гомельская обл., г. Речица, ул. Винзаводская, 4 | 284 331,04 |
| 4 | Имущество филиала «Чечерский» ОАО «Гомельский винодельческий завод», Гомельская обл., г. Чечерск, ул. Советская, 72 А | 55 808,26 |

Подробнее с составом лотов можно ознакомиться на сайте beltorgi.by.
Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 12.01.2022 г. 09.00 по 25.01.2022 г. 17.00:

1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY;

2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB3012 1854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее 30 календарных дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 24.11.2021 г.

* *Оборудование котельной, которое предлагается к продаже, обременено договором безвозмездного пользования № 1 от 23.08.2019 г. с КДУП «Теплосервис». Победитель торгов обязан будет заключить договор безвозмездного пользования с КДУП «Теплосервис» на использование оборудования котельной согласно приложения № 1 к договору №1 от 23.08.2019 г. сроком до 06.01.2023 г.*

Вынікі і высновы

# ГОД НАДЗЕЙ І НОВАГА ВОПЫТУ

## Успамінаем, як спорт вяртаўся да жыцця

**Плануючы новы год, не варта забываць урокі мінулага. У спорце, дзе не бывае дробязяў, а кожны турнір успрымаецца як урок — тым больш. Мінулы 2021 год даў надзею, што спорт ачуняе ад каранавіруснай пандэміі і зноў будзе радаваць аматараў яркімі спаборніцтвамі і гучнымі перамогамі. Дарэчы, так яно і атрымалася. Летась спорт стаў паступова вяртацца ў сваё звычайнае рэчышча. Прайшлі доўгачаканыя летнія Алімпійскія гульні ў Токіа, шматлікія міжнародныя спаборніцтвы па розных відах спорту. І няхай атрыбутамі спартыўных форумаў сталі пустыя трыбуны і строгі эпідэмічны кантроль, галоўнае, што жыццё вяртаецца ў спорт. У рэшце рэшт, шлях да выздараўлення простым не бывае.**




### Узялі іх якасцю

Беларускія спартсмены таксама адаптаваліся да новых рэалій, перамагалі, прайгравалі, выносілі для сябе важныя ўрокі на будучыню. Бадай ці не самы галоўны ўрок беларусы зведалі на Алімпійскіх гульнях у Токіа, дзе заваявалі ўсяго сем медалёў. На жаль, гэта найгоршы паказчык для нашай краіны. Але не абышлося і без выдатных поспехаў беларускіх алімпійцаў. Дзень, калі Іван Літвіновіч узяў «золата» ў скачках на батуце, першы для Беларусі медаль японскай Алімпіяды, увайшоў у гісторыю. Як і Уладзіслаў Ганчароў у 2016 годзе, Іван перамог фаварыта турніру кітайца Дун Дун. Так, у 2021 годзе пачала складвацца выдатная традыцыя. Гістарычным стала і выступленне Максіма Недасекава ў скачках у вышыню. Па-першае, гэта першы медаль у названай дысцыпліне ў гісторыі суверэннай Беларусі. Па-другое, беспрэцэдэнтны выпадак: першае месца раздзялілі два спартсмены: італьянец Джанмарка Тамберы і катарац Мутаз Эса Баршым. Чэмпіёны і бронзавы прызёр Максім Недасекаў паказалі аднолькавы вынік — 2 м 37 см. Узялі рэванш за ўсіх суайчыннікаў беларускія барцы. З сямі медалёў каманды яны заваявалі тры: Ірына Курачкіна і Магамедхабіб Кадзімагамедаў узялі «серабро», Ванеса Каладзінская — «бронзу». Ад гімнасткі Аліны Гарнасько, шчыра кажучы, мала хто чакаў алімпійскага медаля. Але насуперак усяму яна, набраўшы ў суме індывідуальнага мнагабор'я 102,700 бала, заняла трэцюю прыступку п'едэстала.

На Паралімпійскіх гульнях у Токіа беларусы таксама заваявалі сем медалёў, што менш за жаданае. Пяць з іх належаць легендарнаму плыўцу Ігару Бокію. А «серабро» Ягора Шчалканава ў плаванні і «бронза» Лізаветы Пятрэнкі ў лёгкай атлетыцы сталі вельмі прыемнымі сюрпрызамі і паказалі моцную і перспектыўную моладзь. Не абышлося без сенсацый. Аляксей Талай на дыстанцыі 50 метраў брасам устанавіў рэкорд Паралімпіяды, які трымаўся з 1992 года. Пасияховасць выступлення каманды на Алімпійскіх гульнях вызначаецца колькасцю медалёў. Але беларусы ўзялі іх якасцю. Акрамя Алімпіяды, у беларускім спорце ў 2021-м было шмат прыгожых перамог, крыўдных паражэнняў і важных падзей.

### На далікатных жаночых плячах

Першая ракетка Беларусі Арына Сабаленка ў 2021 годзе літаральна «ўзляцела» ў рэйтынгу. Год яна пачала на 10-й пазіцыі, а скончыла — на другой. На шляху да статусу другой ракеткі свету яна выйграла два вялікія турніры ў адзіночным разрадзе, два — у парным, выступіла ў паўфінале турніраў «Вялікага шлема» Wimbledon і US Open. Разам з бельгійкай Эліза Мертэнс Арына перамагла ў фінале жаночага парнага разраду адкрытага чэмпіянату Аўстраліі па тэнісе. Перамога на Australian Open забяспечыла Арыне Сабаленцы першы радок сусветнага рэйтынгу WTA ў парным разрадзе.

Поспехі мастацкай гімнастыкі ў 2021 годзе не абмежаваліся алімпійскай «бронзай» Аліны Гарнасько. На этапе Гран-пры ў Тэль-Авіве беларускія грацыі сабралі 10 медалёў, на этапе Кубка свету ва Узбекістане — восем узнагарод. Не сумаваў па беларусках і подыум чэмпіянату Еўропы, дзе яны заваявалі «серабро» медальнага заліку. На чэмпіянаце свету спартсменкі сем разоў падымаліся на п'едэстал. Гераіні года — Аліна Гарнасько, Настасся Салас і групавічкі Ганна Гайдукевіч, Настасся Малаканава, Настасся Рыбакова, Арына Цыцыліна і Карына Ярмоленка.

У 2021 годзе споўнілася 100 гадоў беларускаму баскетболу. Найлепшы падарунак роднаму спорту зрабілі жаночыя каманды. Каманда Мінскай вобласці «Гарызонт» упершыню заваявала тытул чэмпіянату Еўрапейскай жаночай баскетбольнай лігі. У фінальным паядынку, які праходзіў у Маладзечне, беларускі перамаглі расійскую каманду «Ніка» з Сыктыўкара. За гэтым матчам з трыбун назіраў прэзідэнт EWBL Іга Зандэрс. Ён адзначыў, што ў Беларусі вельмі высокі ўзровень баскетбола, а «Гарызонт» — адна з найлепшых камандаў у Еўропе. Паспяхова выступіла на чэмпіянаце Еўропы па баскетболе і нацыянальная жаночая зборная. Дзяўчаты сталі чацвёртымі.

Гучна заявіла аб сабе лёгкаатлетка Ірына Жук, якая спецыялізуецца на скачках з шастом. У пачатку сакавіка за адно выступленне Ірына двойчы перапісала асабісты і нацыянальны рэкорды ў памяшканні. Спачатку ўзляцела на 4,68 метра, потым — 4,73. А затым на чэмпіянаце Еўропы ў памяшканні Ірына першая сярод беларусаў заваявала медаль кантынентальнага першынства ў скачках у вышыню

Новае жыццё ў 2021 годзе пачалося ў беларускім сінхронным плаванні. У Токіа Васіліна Хандошка і Дар'я Кулагіна сталі першымі беларускімі сінхраністкамі, якія выйшлі ў алімпійскі фінал. Яны занялі 11-е месца ў спаборніцтвах дуэтаў. Вера Буцэль, Маргарыта Кірылюк, Яна Кудзіна, Ксенія Куляшова, Настасся Навасёлава, Валерыя Пузь, Настасся Сувалава, Ксенія Трацэўская і Аляксандра Высоцкая заваявалі «серабро» ў дысцыпліне «хайлайт», выступаючы на чэмпіянаце Еўропы па водных відах. На гэтым жа турніры дзяўчаты сталі бронзавымі прызёрамі і ў камбінацыі (адвольная праграма). Васіліна Хандошка стала бронзавым прызёрам сярод салістак у тэхнічнай праграме.

### Рашуча і ўпэўнена

Беларускага тэнісіста Ілью Івашку журналісты назвалі «галоўнай сенсацыяй турніру ATP-250 у Мюнхене», які праходзіў вясной. На тым турніры Ілья абыграў шостую ракетку свету Аляксандра Зверава. Упершыню ў сваёй кар'еры ён аказаўся мацнейшым за тэнісіста з першай дзясяткі. На Уімблдоне беларус дайшоў да чацвёртага раўнда, гэта яго найлепшы вынік на турнірах «Вялікага шлема». На Алімпіядзе ў Токіа ён пратрымаўся даўжэй за ўсіх беларускіх тэнісістаў, дайшоўшы да 1/8 фіналу. Пасля Гульняў Ілья Івашка ва Уінстан-Сейлеме заваяваў свой першы тытул ATP-тура. За год Ілья падняўся на 48-й пазіцыі сусветнага рэйтынгу. І што гэта, калі не бліскучы прарыў?

А ў той жа час у сусветных басейнах вызначыўся яшчэ адзін беларус з імем Ілья. «Серабро» чэмпіянату Еўропы, два «золаты» і «серабро» чэмпіянату Еўропы па плаванні на кароткай вадзе заваяваў у 2021 годзе Ілья Шымановіч. А яшчэ ён абнавіў сусветны рэкорд на этапе Міжнароднай лігі плавання (ISL). Дыстанцыю ў 100 метраў у 25-метровым басейне ён пераадолеў за 55,28 секунды. Пад канец года Ілья Шымановіч стаў чэмпіёнам свету па плаванні на кароткай вадзе. Дыстанцыю ў 100 метраў брасам ён пераадолеў за 55,70 секунды, абнавіўшы ўласны рэкорд.

Беларускія баксёры паўтарылі поспех айчынных баксёраў на чэмпіянаце свету 2003 года. Тады Магамед Арыпгаджыеў заваяваў «серабро», а Віктар Зуеў — «бронзу». У 2021 годзе з планетарнага першынства з сярэбраным медалём вярнуўся Аляксей Алфёраў, а з бронзавым — Яўген Кармільчык.

Скачкі на батуце парадавалі не толькі алімпійскім «золатам» Івана Літвіновіча. На чэмпіянаце Еўропы ў індывідуальных спаборніцтвах Алег Рабцаў выйграў «золата», Уладзіслаў Ганчароў — «серабро». А разам яны сталі чэмпіёнамі Еўропы ў сінхронных скачках. Іван Літвіновіч, Алег Рабцаў, Уладзіслаў Ганчароў і Аляксей Дудараў падняліся на найвышэйшую ступень п'едэстала ў камандным заліку. На чэмпіянаце свету Алег Рабцаў і Андрэй Буйлоў узялі «золата» ў сінхронных скачках. Беларусы сталі чэмпіёнамі свету і ў камандным турніры. У індывідуальных спаборніцтвах Алег Рабцаў заваяваў «бронзу».

### Аб'яднаныя адной мэтай

Паспяхова склаўся для беларусаў чэмпіянат свету па веславанні на байдарках і каноэ, адкуль яны прывезлі восем медалёў. У актыве спартсменаў — чатыры залатыя, два сярэбраныя і два бронзавыя медалі. Чэмпіёнамі свету сталі Мікіта Борыкаў, Вольга Клімава, экіпаж каноэ-чацвёркі ў складзе Алены Наздровай, Надзеі Макарчанкі, Аляксандры Калаур і Вольгі Клімавай і экіпаж байдаркі-чацвёркі: Марына Літвінчук, Маргарыта Махнёва, Надзея Папок і Вольга Худэнка. У агульным заліку беларуская каманда заняла другую пазіцыю.

Не адставала ад старэйшых калег і маладое пакаленне спартсменаў. А ў лёгкай атлетыцы моладзь нават пераўзышла дарослых. Беларусы заваявалі пяць медалёў на чэмпіянаце свету сярод юніёраў па лёгкай атлетыцы ў Кеніі. Столькі ж медалёў прывезлі з юніёрскай Еўропы. Прычым удалося гэта адным і тым жа спартсменам. Напрыклад, Мацвею Волкаву (скачкі з шастом) і Марыёле Букель (кіданне молата), Аліне Нікіценцы (кіданне дыска). Алеся Гетманава, Павел Глінчук, Арына Мартынава, Ксенія Дзібук сталі медалістамі юніёрскага чэмпіянату свету па барацьбе. А на І Гульнях СНД беларускія спартсмены заваявалі 69 медалёў, сярод якіх 8 залатых, 32 сярэбраныя і 29 бронзавых.

### Чорная паласа

Мінулы год прынёсіў беларускім спартсменам не толькі радасць перамог, але і горыч паражэнняў. Хакеісты не прайшлі алімпійскую кваліфікацыю, у вырашальным матчы ўступілі 1:2 камандзе Славакіі. На чэмпіянаце свету беларуская хакейная зборная прайграла шэсць матчаў з сямі і замкнула табліцу сваёй групы. Найбуйнейшым паражэннем у сваёй гісторыі «адзначыліся» беларускія футбалісты. У матчы адборачнага турніру чэмпіянату свету — 2022 яны ўступілі камандзе Бельгіі з вынікам 8:0. Не заўсёды шанцавала і тэнісістам. Беларускія тэнісісткі прайгралі камандзе Аўстраліі з вынікам 1:2 у розыгрышы Кубка Білі Джын Кінг, які праходзіў у Празе, і выбылі з барацьбы за галоўны трафей турніру. Мужчыны ўступілі сапернікам з Аргенціны ў першым крузе І сусветнай групы Кубка Дэвіса. Вынік сустрэчы — 4:1.

Мінулы 2021-ы год быў цікавы, але 2022-і будзе яшчэ цікавейшы. Інакш у спорце немагчыма. Наперадзе нас чакаюць зімовыя Алімпійскія гульні ў Пекіне, мноства незабыўных чэмпіянатаў свету і Еўропы, рэкордаў, перамог, сенсацый. І, спадзяемся, іх галоўнымі героямі будуць і беларускія спартсмены.

# Медальныя скарбонкі папаўняюцца

### У традыцыйным аглядзе «Звязды» дзелімся добрымі спартыўнымі навінамі

**ГЕРОІ ТЫДНЯ.** Беларускія біятланісты выступілі на пятым этапе Кубка свету ў нямецкім Абергофе. Дзінара Алімбекава заняла трэцяе месца ў гонцы пераследу. Пры двух промахах на чатырох агнявых рубяжах алімпійская чэмпіёнка ўступіла 42,7 секунды лідару агульнага заліку нарвежскай біятланістцы Марце Алсбю-Ройселан. Пераможца паказала вынік 33 хв.18,8 сек., дапусціўшы два промахі на стрэльбішчы. Гэта першы асабісты п'едэстал Дзінары ў сезоне. Раней яна пяць разоў займала чацвёртыя месцы ў асабістых гонках. Цяпер у яе актыве 418 балаў, што дазваляе алімпійскай чэмпіёнцы займаць 3-е месца ў агульным заліку Кубка свету.



Ганна Сола сталая сярэбраным прызёрам у спрынтарскай гонцы на 7,5 км з двума агнявымі рубяжамі. Дыстанцыю яна пераадолела за 23 хв. 37,2 сек., дапусціўшы два промахі на агнявых рубяжах. Ганна мае 374 балы і займае шостую пазіцыю ў агульным заліку Кубка свету.

У Абергофе беларускія біятланісты Мікіта Лабастаў, Антон Смольскі, Дзінара Алімбекава і Ганна Сола занялі другое месца ў змешанай эстафеце. Падчас дыстанцыі беларусы ўвесь час знаходзіліся ў лідарах і на васьмі агнявых рубяжах выкарысталі ўсяго пяць дадатковых патронаў. Асабліва вызначылася Ганна Сола, якая пачала заключны этап, адстаючы ад лідараў на паўхвіліны. Яна здолела адыграць 11 секундаў, але падчас апошняй стральбы са становішча стоячы дапусціла два промахі, што не дазволіла ёй прэтэндаваць на перамогу. У выніку беларусы паказалі вынік 1 гадзіна 29 хв. 14,5 сек.

Наступны этап Кубка свету па біятлоне з 12 да 16 студзеня будзе прымаць нямецкі Рупольдынг.

**ПРАРЫЎ ТЫДНЯ.** Тэнісістка Аляксандра Сасновіч пераадолела 30 пазіцый у абноўленым рэйтынгу Жаночай тэнісной асацыяцыі (WTA). Беларуска паднялася са 107 на 77-е месца. Прычынай такога прарыву стала яе выступленне на турніры ў Мельбурне, дзе яна дайшла да фіналу. У фінальным матчы Аляксандра Сасновіч уступіла прадстаўніцы ЗША Амандзе Анісімавай (78-ы нумар рэйтынгу) з вынікам 7:5, 6:1, 4:6. У кар'еры Аляксандры гэта трэці фінал на турнірах WTA.

**МЕДАЛІ ТЫДНЯ.** Беларускія канькабежкі Ганна Ніфантава, Марына Зуева і Кацярына Слоева занялі другое месца ў камандным спрынце на чэмпіянаце Еўропы ў Херэнвене. Вынік беларусак — 1 хв. 31,18 сек. Яны ўступілі толькі прадстаўніцам Польшчы.

**АБ'ЯВА ТЫДНЯ.** Кантынентальная хакейная ліга выступіла з афіцыйнай заявай аб эпідэмічнай сітуацыі ў клубах. Па стане на раніцу 8 студзеня ў трох клубах КХЛ («Аўтамабіліст», Екацярынбург, «Салават Юлаеў», Уфа і ЦСКА, Масква) ПЛР-тэсты на каранавірус паказалі станоўчы вынік у вялікай колькасці хакеістаў і прадстаўнікоў клубаў. Найбліжэйшыя матчы з удзелам гэтых камандаў адменены. У КХЛ адзначылі, што галоўная задача — не дапусціць масавай успышкі захворвання па ўсёй лізе, захаваць здароўе ўдзельнікаў, скончыць чэмпіянат, правесці плэй-оф і вызначыць пераможцу. Будуць праводзіцца матчы тых камандаў, у якіх эпідэмічная абстаноўка застаецца стабільнай. КХЛ правяла некалькі экстранных нарад, дзе абмеркавала розныя варыянты развіцця падзей. Канчатковае рашэнне будзе вядомае пазней, калі ліга правядзе сумесную нараду з клубамі, сказана ў заяве КХЛ.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

# ЯКІЯ ТАЯМНІЦЫ ХАВАЕ ЦАРКВА Ў АЛЬБЕ?

**СВЯТА-ЮР'ЕЎСКАЯ царква ў в. Альба Івацэвіцкага раёна на парозе свайго 330-годдзя, а сёлета тут адзначылі яшчэ адну важную дату — 30-годдзе адкрыцця.**

На будынку царквы таблічка: гісторыка-культурная каштоўнасць, 1692 год пабудовы. Уяўляеце, велікодны вокліч «Хрыстос Уваскрос!» гучаў тут больш за 300 разоў! І сёлета Івацэвіцкае благачынне святкавала важны юбілей — 30-годдзе з дня адкрыцця пасля савецкіх ганенняў.

Царква стаіць на паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі, на скрыжаванні двух гасцінцаў: Ружаны—Івацэвічы—Гродна (Беларусь—Польшча) і з Вільні на Валынь (Літва—Украіна).

— Траса Ружаны—Гродна праз Альбу засталася, а другі гасцінец — гэта старая лясная дарога, яная захавалася таксама. Яна ідзе з Вільнюса, праз Слонім, праз Альбу лесам пайшла на Гута-Міхалін, Бярозу, Антопаль і на Валынь, на Украіну. Усе войны па гэтых трактах праходзілі, таму наша царква ўся зрашэчаная кулямі, — расказвае айцец Віталій Казімірчык, ураджэнец гэтых мясцін, які па справах аказаўся ў Альбе.

Настаяцель Бялавіцкай царквы айцец Генадзь Равуцкі апякуецца і Альбаўскім прыходам. Богаслужэнні ў Альбе цяпер праводзяцца рэдка — у прастольнае свята і на вялікія святах царкоўнага календара, але рамонт зроблены добры, усё зяе чысцінёй і парадкам — рыхтаваліся да юбілею. Гісторыю храма ведае і айцец Віталій, які з маленства рос у гэтых мясцінах і ад старых людзей чуў пра розныя выпадкі, звязаныя з царквой, шмат цікавіўся і сам архіўнымі дакументамі, як вырас, прадаўжае шукаць звесткі і цяпер.



## Вітражы і акустыка царквы

Вонкава царква ў гонар святога велікамучаніка Георгія Перамаганосца ў Альбе вельмі нагадвае Бялавіцкую царкву, якая таксама з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю, але па дакументах яна ўпамінаецца з сярэдзіны 18 стагоддзя. Архітэктурны почырк, лічы, аднолькавы, і каб не знайшліся клірав́ыя ведамасці ў Альбе, яна б таксама адносілася да больш позняга перыяду будаўніцтва. Адсюль просіцца вывад, што абедзве царквы — і Альбаўская, і Бялавіцкая — прыкладна равесніцы, проста не захавалася дакладных дакументаў у Бялавічах.

Царква ў Альбе драўляная. Усё ў ёй дыхае гісторыяй, звязанай з жыццём не аднаго пакалення тутэйшых людзей. Царква прасторная, у белых і нябесна-блакітных колерах сцен і купала, што надае ёй святочнасці і ўрачыстасці. Унутры праз фарбу праглядваецца здаровае дрэва, пэўна, векавых дубоў, лістоўніцы ці грабу. На верхняй частцы вокнаў вітражы сіняга і цёмна-бардовага колеру — як напамін аб «родных» узорах аканіц. Дарэчы, вітражныя элементы захаваліся ў дзвярах царквы. І колер іх мяняецца ў залежнасці ад часу сутак: то сіні, то блакітны, то карычневы, то раптам ружовы... Падчас богаслужэння святло праз вітражы ў пэўны час падае на абразы, якія набываюць то нябеснае адценне, то крываватае. Гэта асабліва ўражвае падчас выканання песнапення ці чытання Евангелля. Бацюшкі адзначаюць, што служыць тут лёгка, акустыка дзіўная — голас напружваць не трэба.

## Звесткі аб прыходзе з кліравых ведамасцяў

— У 1908 годзе царква дабудоўвалася. Калі быў устаноўлены іканастас, яна стала малая памерамі і дабудоўвалася да гэтага слупа, — паказвае бацюшка, — тады стала амаль напалову большай. Па кліравых ведамасцях 1931 года на Альбаўскім прыходзе налічвалася 3 807 чалавек, а цяпер у Альбе мо, 20 чалавек, у Верашках прыблізна 25, у Куляшах мо, 15... Ва ўсёй акрузе з г. Косава, хіба, столькі не набярэцца, — кажа айцец Віталій, які стаў нам гідам у гэтай паездцы.

Разгортваем рэліквію — кліравую ведамасць царквы святога велікамучаніка Георгія Перамаганосца Косаўскай воласці, уезда Косаўскага, ваяводства Палескага, Палескай епархіі 1931 года. Запісы на польскай і рускай мовах. У канцы ведамасць аб прыходзе: «Хутар Альба (вёскай Альба стала ў 60-я гады XX стагоддзя): дамоў — 105, мужчын — 246, жанчын — 289. Вёска Квасевічы: дамоў — 165, мужчын — 468, жанчын — 468. Юрашкі: 86 дамоў, 198 мужчын і 205 жанчын». Тут бацюшка ўдакладняе: «Пасля Вялікай Айчыннай вайны з Юрашкоў стала дзве вёскі, адна стала называцца Верашкі, а другая Юрчыкі, пэўна, ад таго, што царква Юр'еўская (Георгія Перамаганосца). Дзве вёскі былі як адна, адзін народ, а Альба — гэта больш заможныя людзі, хутаране.

— Раней у Альбаўскі прыход уваходзіла да гэтых яшчэ чатыры вёскі Пружанскага раёна: Астрова, Шчытнае, Верчыцы, Нядзельнае. Храм у в. Шчытнае, што за пяць кіламетраў ад Альбы, аддалі католікам пад касцёл, а праваслаўны прыход быў пераведзены сюды. Абразы захаваліся, і іх пераносілі з той царквы хрэсным ходам у 1927 годзе. Вось гэта верхнія іконы іканастаса з той Шчытнаўскай царквы, — паказвае бацюшка.

Гартаем кліравую ведамасць: «Царква пабудавана ў 1692 годзе на сродкі прыхаджан. У час Першай сусветнай вайны стан яе моцна пацярпеў, дах патрабуе неадкладнага рамонту...».

— Якія матэрыялы тады былі? Салома ды чарот, — удакладняе бацюшка. — Дах быў чаротавы, вежы і купалы — металічныя. За польскім часам царкву пакрылі гонтаю — дошчачкамі. Я яшчэ памятаю, дах дзе-нідзе працякаў, але не моцна.

Чытаем далей ведамасць: «Будынак — драўляны, званіца з царквою, прастол адзін у імя велікамучаніка Георгія Перамаганосца. Начыннем бедная. (Уся царкоўная маёмасць была эвакуіравана ў Расію ў Першую сусветную — удакладненне айца Віталія). Па штаце прызначаны святар і псаломшчык. «Дараванне» 600 злотых на год ад урада. Даход — скарбоначны.

## Настаяцелі

Паслужныя спісы: «Настаяцель — протаіерэй Канстанцін Мікалаевіч Раждзественскі нарадзіўся 7 верасня 1879 года ў мястэчку Раманава Слуцкага павета Мінскай губерні. Узнагароджаны санам протаіерэя да свята Вялікадня ў 1930 годзе». Аўтара радкоў здзіўляе такое гучнае прозвішча, а бацюшка тлумачыць: «У царскай Расіі архіерэй пры заканчэнні семінарыі найлепшым выпускнікам дарыў прозвішчы, звязаныя з галоўнымі царкоўнымі святамі. Адсюль Раждзественскі, Вазнясенскі, Троіцкі, Праабражэнскі...»

Бацюшка прапануе выйсці ў двор царквы. За каменнай агароджай — вясковыя могілкі. А на тэрыторыі царквы стаіць помнік святару Альбаўскай царквы Іаану Антонавічу Дзявіцкаму, які памёр у 1932-м на 37 годзе жыцця ад туберкулёзу. Побач пахаванні ўсёй яго сям'і — жонкі і маленькай дачкі.

— Былі бацюшкі і раней, але ў 1914 годзе людзі паехалі ў Расію, у бежанцы. Засталіся адзінкі. Мой бацька расказваў, што ў Верашках засталіся два жылыя дамы. Мой дзед з сям'ёй быў у Іркуцкай вобласці. А тыя, што засталіся тут, жылі заможна. Вядома, людзі ўсё пакідалі. Дзе вуліца, стажкі сена стаялі, не трэба было ні на балота ехаць, ні ў поле — усё на месцы...

Пад вялізнай акацыяй бацюшка расчысціў ад імху камень, на ім надпіс, але неразборлівы. Магчыма, гэта магіла яшчэ якогасьці святара.

## У Першую сусветную і пры Польшчы

— Падчас Першай сусветнай тут каля храма кайзераўцы размяшчалі сваё войска. Побач стаялі дзот, палявая кухня, у храме начавалі салдаты. Але ў ім і знадворку ніхто нічога не чапаў, — працягвае маляваць карціну былых часоў бацюшка. — Адзін вясковы стараста расказваў пра такі выпадак: адзін з нямецкіх салдат у храме закурыў, а вясковы стараста, які жыў побач, убачыў і паскардзіўся ваеннаму начальству. Афіцэр выслухаў яго і даў каманду расстраляць салдата за апаганьванне святыні — храма.

Царква ў Альбе не пуставала ў 20-30-я гады XX стагоддзя. Калі людзі вярнуліся з бежанцаў, тут ужо панавалі палякі. Іх называлі асаднікамі. «За царквой вунь тое поле — там жылі асаднікі, а на той бок Юрчыкаў ёсць урочышча Беганіца, там была цэлая вёска палякаў. Святаром служыў Канстанцін Раждзественскі да 1943 года. У той час царкоўнае жыццё тут актыўна развівалася. Насупраць храма была пабудавана школа. Двухпавярховая, драўляная. Яна ў той час дзейнічала як агульнаадукацыйная, дзе выкладаўся Закон Божы. Настаўнікі ў ёй былі палякі, а Закон Божы выкладаў праваслаўны святар у старэйшых класах, матушка — у малодшых класах, — тлумачыць айцец Віталій. — Дзеці строга былі абавязаныя наведваць богаслужэнні: каталіцкага веравызнання — хадзіць у касцёл у Шчытнае, а праваслаўныя — у царкву ў Альбе. Было два хоры. Матушка добра спявала і вучыла царкоўным спевам моладзь. Па святах спяваў маладзёжны хор на балконе і хор каля царскіх варот. Псаломшчык быў адукаваны, з духоўнага вучылішча. Народу ў царкве было столькі, што не прабіцца. На Вялікдзень, казалі старажылы, усё гэтае поле вакол царквы, што цяпер пазарастала, было ўсё ў павозках і кастрах: людзі на вазах, пад вазамі, каля кастроў грэюцца ў чаканні Вялікадня, калі ён выдаваўся ранній вясной. Паломніцтва цэлае было...»

Віталій Казімірчык успамінае адзін выпадак, які здарыўся пры Польшчы: «Як расказвала маёй бабулі сястра, яе і яшчэ некалькі маладых хлопцаў і дзяўчат падгаварылі да свята 7 лістапада на званіцы вывесіць чырвоны савецкі сцяг. Такі перапалох пачаўся! З гміны з Ружан, з Косава жандары наехалі — такая правакацыя! Але мясцовыя людзі нікога не выдалі».

## «У царкву заходзілі, калі хто паміраў...»

У 1939 годзе ўсталявалася савецкая ўлада. У той час царкву не чапалі. Як служылі святары, так і служылі, але мясцовых палякаў вывезлі.

— У 1943 годзе святар Канстанцін Раждзественскі быў забіты ў Гута-Міхаліне. Ён ехаў па царкоўных справах у Бярозу, але тады была неразбярыха, і хто яго забіў, невядома. У яго было 6 дачок і сын. Старэйшы Глеб упамінаецца ў кнізе «Памяць. Івацэвіцкі раён» як загінулы на фронце сын святара, — расказвае бацюшка. — І потым сям'я іх з'ехала адсюль недзе ў Мінскую вобласць.

Падчас Вялікай Айчыннай вайны школа ў Альбе згарэла, тады ў ёй размяшчалася нямецкая паліцыя. Царква выстаяла, але ўся шалёўка — у кулях. Кулямёт, казалі старажылы, на званіцы стаяў. З яе па трасе адкрывалі агонь, а з трасы — агонь на царкву...

— Нашы сёлы ў наваколлі амаль усе ў Вялікую Айчынную пагарэлі, бо стаяць па трасе, але да 1950-х адбудаваліся, — расказвае святар. — Наша сям'я ў вайну, казалі бацькі, два гады зімавала ў зямлянцы. У пасляваенны час святаром у царкве ў Альбе быў Іосіф Баранаў, гады два служыў Ігнацій Сідаровіч, а потым Канстанцін Молчун. У 1962 годзе царква была зачынена. На Тройцу была апошняя служба. Расказвалі, было многа людзей. І больш сюды святароў не прысылалі. З 1965 года царкву сталі спусташаць. Вокны, вітражы былі разбітыя. Захаваліся з царскіх часоў толькі ручка і кавалачкі вітражоў на дзвярах...

Мясцовы стараста расказвала: яе бацька памёр у 1969 годзе, але хоць царква і была зачыненая, усё роўна, калі хто паміраў, то ў храм прыходзілі, бралі крыж, харугвы, свечкі... Дык вось, калі хавалі бацьку, казала жанчына, яшчэ абразы былі на сценах, а на 40 дзён — голыя рамы.

— Я гэтую карціну таксама застаў, у 1987 годзе тут яшчэ было запусценне, і мы, маладыя, у царкву баяліся хадзіць. Падлога выдраная, і на стolі, па бэльках дошкі таксама выдраныя. Вокны пазабіваныя, дах цячэ — жудасць. У Косава едзем, а свой храм так стаіць... Адзін абраз Божай Маці па пісьму Жыровіцкай Божай Маці, без рамы застаўся, і крыж не чапалі, баяліся.

## Аднаўленне

Ідэю аднавіць храм сваімі сіламі падалі людзі ў 1989 годзе. Дапамог былы старшыня Квасевіцкага сельвыканкама Іван Пропер, сабралі сродкі на дах. Грошай людзі на царкву не шкадавалі, давалі па 10 і 25 рублёў, на іх купілі бляхі. Восенню пасля Праабражэння сталі ўстанаўліваць рыштаванні і пачалі перакрываць. Да зімы купалы былі накрытыя, а вясной — увесь дах. Актыўна падключылася да рэканструкцыі храма праўленне саўгаса «Світанак» і кіраўнік Стэфан Вярэніч. Ён даў брыгаду і прыязджаў асабіста, пытаў у вяскоўцаў і старасты, што трэба яшчэ. Стараста Аляксандр Ганчар і памочнік Уладзімір Шыманчык разам з людзьмі шчыравалі цэлымі днямі. Царскія вароты «свае», з былых часоў захаваліся, толькі абразы на іх новыя. Падчас аднаўленчых работ знайшлі толькі вось гэтую ікону — на палатне. Абраз Ісуса на адным баку, а на другім — Нараджэнне Багародзіцы. Беларуска-літоўскае пісьмо — бясцэнная рэліквія.

У 1991 годзе разжываліся начыннем. За кароткія два гады капітальны рамонт храма быў зроблены.

— 31 жніўня было паўторнае асвячэнне храма епіскапам Стэфанам і айцом Грыгорыем, — успамінае святар. — Народу было многа. У 1992 годзе на Вербную быў прызначаны першы бацюшка. Ім стаў айцец Васілій Сегень. Праз два гады ён пераехаў у Любішчыцы, і настаяцеля сюды ўжо больш не прызначалі. Людзей стала меншаць, сёння многім жыхарам пад 90 гадоў, а царква цяпер адносіцца да Бялавіцкага прыхода.

**Валянціна БОБРЫК,**
*г. Івацэвічы.*

**Фота Валерыя МІСКЕВІЧА.**

Беларусь невядомая

# ПА ЦАРСКІХ ГАДЗІННІКАХ З ДУБРОЎНА

**Развіццё ўязнога турызму — адзін з прыярытэтаў Віцебшчыны ў бягучай пяцігодцы. Тут шмат што можна ператварыць у прывабны турыстычны прадукт, у тым ліку для жыхароў ніблізкіх краін. Напрыклад, швейцарцам будзе цікава пабываць на Дубровеншчыне. І не толькі таму, што там у чыстым полі пабудавалі адно з самых стыльных казіно, але і таму, што швейцарцы калісьці куплялі гадзіннікавыя механізмы менавіта тут. А вы ведалі?**

## Дзякуючы Пацёмкіну

Калісьці ў Дубровенскім краі, які мяжуе з Расійскай Федэрацыяй, выраблялі кішэнныя гадзіннікі. Мала хто пра гэта ведае за межамі раёна, а між тым, гадзіннікавая прадукцыя з Дуброўна вядомая на ўвесь свет. У прыватнасці, рукатворны цуд з далёкага мінулага можна ўбачыць у піцерскім «Дзяржаўным Эрмітажы». На зваротным баку надпіс: «Фабрыка Дубровенская». Той гадзіннік з беларускай глыбінкі можна назваць узорам механізацыі з вялікай літары. Самага пераборлівага эстэта парадуе тое, як ён выглядае: белы эмалевы цыферблат, змешчаны ў корпус, зроблены з серабра...

А пачыналася вытворчасць у кацярынінскія часы. Менавіта ў Дуброўне ў другой палове XVIII стагоддзя адкрылася першая на тэрыторыі сучаснай Беларусі гадзіннікавая фабрыка — і адна з першых у тагачаснай Расіі. Дуброўна тады належала найсвятлейшаму князю Рыгору Пацёмкіну, фавараыту імператрыцы Кацярыны II.

Мясцовыя музейшчыкі і краязнаўцы з вялікім задавальненнем і гонарам расказваюць пра «гадзіннікавае» мінулае. У прыватнасці, пра немца Пятра Нардштэйна, з пераезду якога са сталіцы Расіі ў горад літаральна пачаўся новы час. Імператрыца-асветніца запрасіла яго разам з іншымі іншаземнымі спецыялістамі развіваць расійскую вытворчасць механізмаў для вызначэння часу. Спачатку Нардштэйн вучыў азам гадзіннікавай справы вучняў спецыялізаванага класа Акадэміі мастацтваў.



Першыя гадзіннікавыя мануфактуры ўжо дзейнічалі ў Санкт-Пецярбургу і Маскве. Але... непрыбыткова. Нардштэйн у лісце калегам на радзіму пісаў, што яго папярэднікі працавалі са стратамі. Пацёмкін вырашыў правесці эксперымент, каб высветліць, што патрэбна для выгаднай вытворчасці. І Нардштэйн знайшоў адказ.

## Падарунак майстра

Выбар прыпаў менавіта на Нардштэйна яшчэ і таму, што ён распрацаваў аўтарскую канструкцыю кішэннага гадзінніка і атрымаў адпаведны патэнт у Шведскай каралеўскай акадэміі навук. Прыехаў ён у Расію ў 1766 годзе.

Дарэчы, попыт у Расіі на гадзіннікі быў вялікі, бо іх да адкрыцця ўласнай вытворчасці імпартавалі. Каштавалі яны вельмі дорага. Гэтым і дыктавалася патрэба наладзіць прыбытковую айчынную гадзіннікавую вытворчасць.

Імператрыца, якая запрасіла майстра на аўдыенцыю, была ў захапленні ад падарунка Нардштэйна — цудоўнай прыгажосці пярсцёнка-гадзінніка.

Фабрыку ў Дуброўне немец узначаліў праз 20 гадоў пасля выкладчыцкай работы ў Санкт-Пецярбургу. Інвестар Пацёмкін выдаткаваў 12 тысяч рублёў (на той час вялікая сума грошай). Вытворчасць была з асаблівасцю: станкі запускаліся пры дапамозе спецыяльнай прылады, якая, у сваю чаргу, рухалася пры дапамозе вады. (На іншых вытворчасцях было нажное кіраванне абсталяваннем.)

Нардштэйн укараніў і ўласную сістэму арганізацыі працы. Яго папярэднікі вучылі майстэрству стварэння гадзінніка большменш адукаваную моладзь з гарнізонных школ для дзяцей салдат. Ён жа ўзяў непісьменных юных сялян. Забяспечыў іх усім неабходным за ўласны кошт.

У Нардштэйна не было права атрымліваць без пошліны замежнае абсталяванне. Але гэта не перашкодзіла яму наладзіць выраб канкурэнтаздольнай прадукцыі. Праз некалькі гадоў фабрыка ў Дуброўне пачала працаваць прыбыткова. Выраблялі не толькі кішэнныя гадзіннікі, але і насценныя, сонечныя, карпусы для гадзіннікавых механізмаў, самі механізмы, інструменты рознага прызначэння і іншае.

## Ідэя фэсту

На жаль, сёння ў райцэнтры няма гадзіннікавага прадпрыемства. Ідэя, дарэчы, лунае ў паветры. Калі б знайшоўся інвестар, ды каб добрую маркетынгавую кампанію правесці...

Тутэйшыя не забылі цікавыя факты з мінулага. І ў гонар таго, што Дубровеншчына калісьці была гадзіннікавым краем, некалькі гадоў таму ўстанавілі ў цэнтры гарадка памятны знак. Грацыёзная вежа адразу ж стала месцам для спатканняў, і, безумоўна, даволі арыгінальным турыстычным пунктам. Вышыня дубровенскага «біг-бэна» — каля трынаццаці метраў. На чатырох баках замацаваныя стыльныя гадзіннікі, дыяметр кожнага — метр. Яны адны з самых дакладных ва ўсёй краіне, бо функцыянуюць са спадарожнікавай сінхранізацыяй. Карэкціроўка ходу механізма з космасу дазваляе паказваць рэальны час з дакладнасцю да мілісекундаў.

Неаднойчы агучвалася і ідэя арганізаваць у Дуброўне фестываль гадзіншчыкаў. Падзея можа атрымацца карыснай і цікавай для наведвальнікаў. У час смартфонаў даведвацца пра час па гадзінніку — прыкмета не толькі высокага статусу, але і добрага густу.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.**

Год гістарычнай памяці

# ПРЫСВЯЧАЕЦЦА ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ

**У майстэрні вядомага беларускага скульптара, народнага мастака Уладзіміра СЛАБОДЧЫКАВА маю ўвагу спыніла адна незвычайная работа. Гэта быў даволі вялікага памеру шар, на якім віднелася шмат чалавечых постацяў.**

— Уладзімір Іванавіч, упершыню бачу скульптуру такой формы, — здзівіўся я.

— Гэта адзін з маіх праектаў, які, на жаль, так і не быў ажыццёўлены, — растлумачыў скульптар. І распавёў такую гісторыю.

